ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 87 (3195) Чацьвер, 18 Красавіка 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

РАДЫЕ У ГАДЗІНУ НОЧЫ:

БЭРЛІН, 17. Лейпцыгскі дзяржаўны суд прыгаварыў адназнага рэдактара газ. „Ротэ Фанэ“— тав. Штэйнкэ на 9 месяцаў крэпасьці за надрукаваньне у „Ротэ Фанэ“ вядомай адозвы ЦК КПГ супроць небясьпекі новай імпэрыялістычнай вайны

АПОШНІЯ НАВІНЫ **Б. С. С. Р.**

Адкрыўся зьезд саветаў Гомельшчыны

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Адкрыўся 2 зьезд саветаў Гомельскай акругі. На зьезд прыбыў народны камісар асьветы т. БАЛІЦКІ. У ганаровы прэзыдыум зьезду абраны члены палітбюро ЦК УсеКП(б), члены бюро ЦК КП(б)Б, т.т. Арджанікідзе і Кагановіч. З прывітаньнем зьезду выступілі дэлегаты рабочых гомельскіх фабрык, заявіўшыя зьезд, што рабочыя зробяць усё магчымае, каб выканаць дырэктывы пар тыі і ўраду аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі і павялічэньні прадукцыйнасьці працы.

Праверыць

Пленум ЦК КП(б)Б, які скончыўся гэтымі днямі, паставіў перад усімі савецкімі, партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі важнейшага значэньня задачу: ПРАВЕРЫЦЬ, ці ўсё зроблена нашымі установамі як у цэнтры, так і на мясцох для пасьпяховага правядзеньня сяўбы.

На старонках друку мы ўжо адзначалі рад канкрэтных недахопаў і ненармальнасьцяй у справе падрыхтоўкі да СЯЎБЫ. Некалькі тыдняў, што засталіся да пачатку сяўбы, трэба запаз выкарыстаць для таго, каб праверыць, ці выпраўлены памылкі, якія намі зазначаліся, а таксама што зроблена як у цэнтры, так і на мясцох для выкананьня дырэктыў ураду аб пашырэньні пасеўнай плошчы і ўздыму ўраджайнасьці.

У першую чаргу мы павінны праверыць, што зрабілі ў гэтай галіне нашы САЎГАСЫ і КАЛГАСЫ. Ці забясьпечаны калгасы і саўгасы ў належнай меры насеньнем і мінэральным угнаеньнем, ці адрамантаваны ўвесь сельскагаспадарчы інвэнтар, ці атрыманы крэдыты і як яны выкарыстаны.

СЯЛЯНСКІЯ КАМІТЭТЫ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ павінны гэты каротні тэрмін выкарыстаць для арганізацыі практычнай дапамогі беднаце пры заворваньні палёў, арганізаваўшы добраахвотныя дружыны. Неабходна праверыць, ці мабілізавана грамадзкая думка вёсні вакол гэтага пытаньня, а таксама ці выканана камітэтамі ўзаемадапамогі дыяктыва аб арганізацыі сельска-гаспадарчых майстэрань.

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ КААПЭРАЦЫЯ ў сваю чаргу павінна праверыць, ці выпраўлены памылкі ў галіне кантрактацыі. Што зроблена сельгаскредытнымі таварыствамі для забясьпячэньня насеньнем і ўгнаеньнямі пасеўшчыкаў, з якімі заключаны ўмовы, а таксама па забясьпячэньні беднаты.

Што датычыць ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, мы павінны праверыць, ці выкананa дырэктыва партыі і ўраду аб забясьпячэньні сельскай гаспадаркі неабходным АБСТАЛЯВАНЬНЕМ І МАШЫНАМІ, у прыватнасьці, што зрабілі мэтадзаводы Беларусі для забясьпячэньня сельскай гаспадаркі адваламі і лемяшамі.

У радзе месц сялянства недастаткова азнаёмілася з новым законам аб сельска-гаспадарчым падатку, аб ільготах і абавязковым аграмінімуме. Акругкомы і райкомы павінны ў гэтых мясцох правесьці шырокія сходы беднаты і серадняку, на якіх растлумачыць значэньне ўсіх урадовых мерапрыемстваў у галіне ўзьняцьця ўраджайнасьці і што канкрэтна можна і патрэбна зрабіць у кожным сельсавеце.

Бясспрэчна, у некаторых мясцох кулацкія элементы вёскі будуць рабіць спробы, каб выкарыстаць нашы цяжкасьці ў справе забясьпячэньня сялянства неабходным насеньнем і ўгнаеньнем. Кулакі, зрабіўшы дапамогу беднаце, будуць імкнуцца зкабаліць яе, падпарадкаваць сваёму ўплыву. Райкомы, ячайкі і сельсаветы на мясцох павінны прыняць усе меры, каб групы беднаты далі жорсткі адпор кулацкім спробам.

Паход за ўраджай неабходна абярнуць у САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА, уцягнуўшы ў яго ян мага большую колькасьць калгасаў і саўгасаў, а таксама і індывідуальных сялянскіх гаспадарак.

НА СЭСІІ ПАДРЫХТОЎЧАЙ КАМІСІІ ПА РАЗБРАЕНЬНІ

ТОЛЬКІ ЎСЕАГУЛЬНАЕ І ПОЎНАЕ РАЗБРАЕНЬНЕ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА САПРАЎДНАЙ ГАРАНТЫЯЙ МІРУ

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ тав. ЛІТВІНАВА

ЖЭНЭВА, 16. Адкрываючы 6-ю сэсію падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні, старшыня камісіі Лёўдон прапанаваў канфэрэнцыі першым пытаньнем—савецкі праект аб частковым разбраеньні. Лёўдон напомніў, што 5-я сэсія, адклаўшы савецкі праект да будучага 6-га пасяджэньня, пастанавіла паведаміць аб ім урады і падрыхтоўчая камісія павінна цяпер заслухаць думкі паасобных дэлегацый аб савецкім праекце. Адначасова ён яшчэ раз напамінае, што рашэньне 5-й сэсіі прадугледжвае «працяг работ падрыхтоўчай камісіі па намечанаму ўжо шляху і што таму трэба ўстанавіць, «ці ўкладваецца савецкі праект у рамкі праекту Лігі Нацый». Далей слова прадастаўляецца т. Літвінаву.

Пры напружанай увазе ўсіх выступіў т. Літвінаў.

Абгаворваецца не тэхнічнае пытаньне расстаноўкі пунктаў парадку дня.—сказаў т. Літвінаў,—**але глыбока прынцыповае пытаньне аб тым, ці жадае камісія прыступіць на данай сэсіі да сапраўднага вырашэньня праблемы разбраеньня.** Лічу патрэбным напомніць, што ў рамкі савецкага праекту могуць быць укладаены і могуць быць адначасова з ім абгаворваны ўсякія іншыя прапановы дэлегацый, унесеныя раней, або якія маюць быць унесеныя, бо савецкі праект зьяўляецца ў сэнсе разбраеньня «всеоб'емлющим». Прыняцьце савецкае прапановы аб прынцыпіяльным скарачэньні ўсіх радоў і катэгорый узбраеньня зьнішчыла-бы тыя разгалоссі паміж марскімі дзяржавамі, што цяпер перашкаджаюць работам падрыхтоўчай камісіі і папярэдзіла-бы разгалоссі пры больш канкрэтным абгаварэньні сухасьземных і паветраных узбраеньняў. **З работ камісіі ня відаць наогул, каб іх мэтай было якое-небудзь скарачэньне існуючых узбраеньняў.** У зьвязку з гэтым савецкая дэлегацыя лічыла-бы своячасовым **унясьненне яснасьці ў пытаньне, якія наогул мэты ставіць сабе падрыхтоўчая камісія.**

Усе гэтыя меркаваньні прымушаюць савецкую дэлегацыю яшчэ раз заклікаць камісію да перагляду мэтадаў работы, стаць на рэкамэндуемы дэлегацыяй шлях, супроць якога камісія покуль што ня супярэчыла акрамя заяў аб тым, што гэты шлях новы. Яшчэ на 4-й сэсіі—паўтары гады таму назад, так званы «пракладзены камісіяй шлях» быў ахарактарызаваны, як бязвыхадны і беспрасьветны тупік. На 5-й сэсіі некаторым дэлегатам замітусілася, аднак, дзесьці сьвятло і камісія рашыла, што ёсьць выхад з тупіку. Прайшоў год. Сьвятло аказалася міражом, цемра ў тупіку яшчэ больш згусьцілася. Паўстае пытаньне, ці трэба быць упартым далей і не зьмяняць напрамку шляху, каб выйсьці з тупіку.

Старшыня падрыхтоўчай камісіі ў пацьвярджэньне неабходнасьці паскарэньня работ камісіі спасылаўся на ўзмоцненую нецярплівасьць рабочых арганізацый, якія патрабуюць хутчэйшага ажыцьцяўленьня разбраеньня. Калі старшыня камісіі лічыць, што гэты рух зьяўляецца магутным фактарам у справе разбраеньня, дык савецкая дэлегацыя першая з ім згодзіцца ў гэтым.

Патрабаваньне савецкай дэлегацыі аб пераглядзе мэтадаў работы камісіі і аб пераходзе да абгаварэньня сапраўдных пытаньняў разбраеньня знаходзіць новае дадатковае апраўданьне і ў падзеях апошняга году. Я маю на ўвазе перш за ўсё **ўзмацненьне пагрозы вайны, на якое мы ўказвалі яшчэ на 4-й сэсіі.** Але тады яна можа быць, ня вызначылася яшчэ з такой рэзкасьцю і відзімасьцю для ўсіх, як зараз. **Гэтая пагроза зусім ня выдумка савецкай дэлегацыі. Ужо гэтая акалічнасьць была-бы выстарчальнай для стымуляваньня нашых намаганьняў да хутчэйшага разбраеньня.**

З другога боку для разбраеньня стварылася ў гэтым годзе новая спрыяючая кан'юнктура з пункту погляду ўзмацненьня так званай безапаснасьці, якой Ліга Нацый і падрыхтоўчая камісія надавалі заўсёды выключнае значэньне. Пакт Кэлёга аб адмове амаль усіх дзяржаў ад вайны, у якасьці аброї нацыянальнай палітыкі, стаў фактам. **Дзякуючы ініцыятыве і асаблівым намаганьням савецкага ўраду, пакт Кэлёга ўжо ўступіў у моц ва ўзаемаадносінах паміж 8-ю дзяржавамі,** пры гэтым—іменна на тым бучастку Эўропы, які лічыўся найбольш пагражаючым. Савецкая дэлегацыя лічыла і далей лічыць, што **ў сучасных умовах,**—сказаў у заключэньне т. Літвінаў,—**найбольш сапраўднай гарантыяй міру зьяўляецца ўсеагульнае і поўнае разбраеньне. Адпаведны праект канвэнцыі аб поўным разбраеньні быў, на жаль, адхілены падрыхтоўчай камісіяй і савецкая дэлегацыя зможа яго ўноў высунуць толькі на міжнародай канфэрэнцыі па разбраеньні, калі яна калі-небудзь будзе склікана.** Дэлегацыя ўносіць праект канвэнцыі аб прапарцыянальным і прагрэсыўным скарачэньні ўсіх узбраеньняў, які ў значнай ступені ўжо цяпер зьменшыць пагрозу вайны і зможа паслужыць этапам для далейшага разбраеньня. Я рэкамандую гэты праект 6-тай сэсіі падрыхтоўчай камісіі і прашу паставіць яго **першым пунктам парадку дня. Я глыбока пераконаны ў тым, што толькі прынцыцьце такой прапановы вывядзе камісію з яе затрудненьняў, узнагародзіць яе за дарэмна патрачаны час і работу і прымусіць прызнаць, што падрыхтоўчая камісія, нарэшце, сапраўды занялася пытаньнем аб разбраеньні».**

Лёўдон ставіць на галасаваньне пытаньне, ці жадае камісія абгаварыць савецкі праект з тым каб устанавіць, ці прадстаўляе ён базу для далейшых работ, замест праекту Лігі. Узьнікае доўгая дыскусія, у якую паасобныя дэлегаты яўна імкнуцца ўнесьці блытаніну. Тав. Літвінаў прапануе галасаваць толькі пытаньне аб абгаварэньні савецкага праекту, у выпадку адхіленьня якога камісія вырашыць, якія пытаньні трэба будзе абгаварыць у далейшым. Лёўдон ставіць пытаньне аб прыняцьці парадку дня цілкам. 3-за адсутнасьці супярэчаньня прапанаваны Лёўдонам парадак дня лічыцца прынятым. 17-га красавіка будуць агалошаны турэцкія прапановы і адбудзецца абгаварэньне савецкага праекту. (ТАСС).

* * *

ЖЭНЭВА, 16. Агалошаны мэмарандум турэцкага ўраду. Мэмарандум прапануе ўстанавіць прынцып роўнага абмежаваньня ўзбраеньняў для усіх дзяржаў на падставе вызначанага максымуму, які «неабходны вялікай дзяржаве для законнай абароны», забараніўшы далейшае ўзбраеньне малым дзяржавам, якія не дасягнулі гэтага максымуму. Мэмарандум падкрэсьлівае посьпехі, дасягнутыя пактам Кэлёга і потым указвае, што Турцыя, далучыўшыся да пакту Кэлёга, пасьпяшыла таксама далучыцца і да маскоўскага пратаколу, які разглядаецца ёю як элемент кансалідацыі пакту Кэлёга.

Мэмарандум зазначае, што ажыцьцяўленьне разбраеньня будзе лепшай санкцыяй дагавораў, якія заключаюцца для забясьпячэньня міру. Мэмарандум лічыць, што адзнай з крыніц нябясьпекі нападу зьяўляецца няроўнасьць узброеных сіл. З прычыны гэтага, Турцыя прапануе пакласьці за асову разбраеньня прынцып роўнасьці. (ТАСС).

ШОСТЫ АКТ КАМЭДЫІ РАЗБРАЕНЬНЯ

У Жэнэве адкрылася 6-ая сэсія падрыхтоўчай камісіі да канфэрэнцыі па разбраеньні. Па практыцы пяці ранейшых нумароў жэнэўскай «мірастворчай» праграмы, ня цяжка прадбачыць фінал інсцэніроўкі за нумарам шостым. Звычайныя нікчэмныя камэдыі падкупаюць невымагальных гляда чоў добрым канцом. Але нават самым нікчэмным жэнэўскім камэдыям ня ўдаецца прыклеіць падобны добры «хвост».

І кожны раз у «публікі» застаецца ўсё больш няпрыёмны асадак. Тав. Літвінаў у сваёй прамове добра ахарактарызаваў «бязвыхадны і беспрасьветны тупік, у якім апынулася падрыхтоўчая камісія, гэтае дзіця Лігі. Ён агаль біў «двуліцасьць і неўгрунтаванасьць спасылак таго ці іншага ўраду на ілжывыя нацыянальныя інтарэсы, якія нібы перашкаджаюць яго краіне разброіцца». Словы прадстаўніка савецкай дэлегацыі апіраюцца на бясспрэчныя факты.

І сапраўды, Ліга Нацый хутка адсьвяткуе 10-ці гадовы юбілей падпісаньня вялікімі дзяржавамі ее статуту. За час існаваньня Лігі над крылом яе працуюць дзесяткі камісій па разбраеньні, падкамісій і камітэтаў экспэртаў: за гэты час **выпрацаваны сотні рэзалюцый і праектаў аб разбраеньні, нацыянальнай безапаснасьці, аб няпоўным урэгуляваньні спрэчак. А вынікі? Вялічэзная мілітарысцкая машына, якая кіруецца вайсковымі і цывільнымі слугамі магутнага канцэнтраванага капаліцкага капіталу, высмоктвае з арганізму прыгнечаных ім «сваіх» і чужых народаў ўсе жыцьцёвыя соки. На вялічэзных ваенных заводах і суднабудаўнічых вярфях, у атуленых таямніцай хэмічных лябараторыях, абсталяваных паводле апошняга слову тэхнікі, выпрацоўваюцца мільярды сьмяротных снарадаў і пуль, мільярды кубамэтраў атручваючых газаў. З поўнай нагрузкай, з усё ўзрастаючым тэмпам працуе гэтая жахлівая машына.**

Міжнародна - палітычная атмасфера згушчаецца. **Стваральцца ваенныя саюзы, дыплёматычныя камбінацыі і контр-камбінацыі, блёкі і контр-блёкі ўнутры імпэрыялістычнага лягеру, і ўсе імпэрыялістыя разам узятыя падрыхтоўваюць напад на ўсё яшчэ адзіную ў сьвеце пралетарскую дзяржаву. На суседзтнай шахматнай дошцы імпэрыялістыя растаўляюць фігуры для надыходзячай вайны.**

Натуральна, узьнікае пытаньне—што-ж робіць наша савецкая дэлегацыя ў Жэнэве, дзе разгортваецца гэтае іляжэ-міратворчае дзеяньне прадстаўнікоў каліталістычных дзяржаў? Не дзеля буржуазных дыплёматаў савецкая дэлегацыя езьдзіла і зноў паехала ў Жэнэву, а **дзеля працоўных, якіх яны хочуць ашукаць.**

Прадстаўнік савецкага ўраду ў Жэнэве зноў паставіў перад усім сьветам пытаньне аб вайне і міры,—аб ваенным пагрозе, аднаго якой, гаворачы словамі т. Літвінава—«ніколі не выяўлялася з такой рэзкасьцю і выразнасьцю для ўсіх, як зараз». Ён паставіў усім гэтым Кашэндэнам, Гібсонам, Масілі і кампаніі **пытаньне рубам—ці хочаце вы разбройвацца, ці не?** Ясныя, выразныя савецкія прапановы, якія маюць на мэце сапраўднае, а не паперовае разбраеньне, хутка прымусяць двуліцых буржуазных дыплёматаў даць ясны адказ. Мець якія-небудзь ілюзіі адносна характару гэтага адказу было-б ня толькі наіўнасьцю, але простым здачынствам у адносінах да міжнароднага пралетарыяту.

Усякі сьвядомы рабочы ў СССР і на Захадзе павінен зразумець, што работа дэлегацыі савецкага ўраду, якая дзейнічае ў варожым буржуазным акружэньні, натыкаецца на вялікія перашкоды. Яна зможа **толькі паставіць пытаньне. Вырашаць-жа яго можа толькі міжнародны пралетарыят. Справа вызваленьня рабочых ад ярма мілітарызму, ёсьць справа саміх рабочых. Справа абароны бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту — Савецкага Саюзу—ад нападу, які рыхтуецца на яго сусьветнай буржуазіяй, таксама ёсьць справа самога сусьветнага пралетарыяту.**

Для гэтага патрэбна **сыстэматычная, няпрымірымая і бязьлітасная барацьба ня толькі супроць буржуазіі, але і супроць сацыял-дэмакратыі. Бо чым, як ня подлым, нясумленным ашуканствам мас зьяўляецца спроба ўпэўніць іх шляхам «пэтыцыйнай кампаніі» і пасылкі дэлегацый у Лігу Нацый у тым, што жэнэўская установа,—гэтая спэкулянцкая біржа буржуазных дыплёматаў,—пад пацыфісцкай шыльдай можа прывесьці чалавецтва да выратаваньня ад мілітарысцкай чумы.**

Незразумела толькі, навошта пасылаць дэлегацыі і заграмаджаць пошту пэтыцыямі, калі **Ліга Нацый і 2-гі Інтэрнацыянал—блізкія і родныя ўстановы, якія працуюць у самым цесным духоўным і арганізацыйным кантакце.**

Аб усім гэтым рабочыя ўсяго сьвету павінны моцна памятаць асабліва цяпер, калі ідзе падрыхтоўка да першамайскай міжнароднай мабілізацыі пралетарскіх сіл супроць мілітарызму і ўсёй капіталістычнай сыстэмы, якая параджае яго і харчуе.

(«ПРАВДА»).

Ангельская дэлегацыя ў СССР і Польшча

Калі ўпяршыню зьявіліся паведамленьні аб тым, што ангельская дэлегацыя зьбіраецца ў СССР, дык у Варшаве рабілі выгляд, быццам, не надаюць гэтаму асабліваго значэньня. З першага погляду можа паказацца, што гэта сапраўды так. Абвастрэньне палітычнага крызісу ў Польшчы, выклікапае адданьнем пад суд дзяржаўнага трыбуналу міністра фінансаў Чэховіча і апошняй рэзкай прамовай Пілсудзкага, засланіла сабою важныя падзеі міжнароднай палітыкі. На задні плян адсунута таксама ацэнка паездкі ангельскай дэлегацыі ў СССР. Тым ня менш, польскі друк уважліва сочыць за дзейнасьцю гэтай дэлегацыі. З кароткіх заўваг друку аб ангельскай дэлегацыі ў СССР відаць, якое вялізнае значэньне надаецца ёй Польшчаю. Трэба лічыць, што калі ўнутраны палітычны крызіс закончыцца, дык польскі друк удзеліць больш увагі паездцы ангельскай дэлегацыі ў СССР.

Першая ластаўка ў гэтых адносінах ужо зьявілася ў газэце «Момэнт» у форме нібы, карэспандэнцыі з Данцыгу пад загалоўкам: «Ангельская дэлегацыя ў СССР і польскі экспарт у Англію». Ясна, што газэта ня хоча, каб выказваемыя ёю думкі прышсвалі прамысловым колам Варшавы, і таму падае іх «экспартным колам» Данцыгскага порту... Па словах газэты, гэтыя колы моцна цікавяцца ангельскай гандлёва-прамысловай дэлегацыяй у СССР. У гэтых колах, быццам, перадаюць, што савецкі камісарыят гандлю хоча скарыстаць гэта наведваньне, каб выпіснуць з ангельскага рынку іншыя Усходня-Эўрапейскія аграрныя краіны, асабліва Польшчу, якія маюць у Англіі значны рынак збыту для сваіх с.-г. прадуктаў.

«У той час,—піша газэта,—калі ў Польшчы заняты стварэньнем экспартных сындыкатаў с.-г. прадуктаў для ўтрыманьня ангельскага рынку, савецкі камісарыят гандлю прабуе забясьпечыць для расійскага экспарту рынак ў Англіі. На першым мейсцы стаіць экспарт лесу, бэкону, яек і інш. прадуктаў, якія стаяць на чале польскага экспарту ў Англію».

Далей газэта піша, што ў сувязі з гэтым у Маскве прымаюцца меры да выданьня дэкрэту аб новай канцэсійнай палітыцы з мэтай прыцягнуць ангельскі капітал і тым самым ваяваць рынак збыту ў Англіі.

«Ясна,—заключае газэта,—што савецкая эканамічная палітыка ў адносінах да цяперашняй ангельскай дэлегацыі не на карысьць польскага экспарту ў Англію. Ужо зараз савецкія імпарцёры займаюць на ангельскім рынку вельмі забясьпечаныя пазыцыі і зьяўляюцца вельмі сур'ёзнымі канкурэнтамі для польскіх імпарцёраў.

З кожным месяцам расійскі с.-г. экспорт у Англію ўсё павялічваецца, натуральна, за кошт польскіх с.-г. прадуктаў». Пры гэтым газэта лічыць патрэбным адзначыць, што ў Лёндане пануе пэўнае недавер'е да польскіх тавараў. За кароткі прамежак часу там выкрылі, што два транспарты польскага масла былі зьмешаны з маргарынам. Такая нядобрасумленнасьць з боку некаторых экспарцёраў, па словах газэты, шкодна адзываецца на польскім экспарце ў Англію,—асабліва зараз, калі СССР гатоў скарыстаць гэта для ваваёвы ангельскага рынку.

З усяго гэтага газэта робіць наступны вывад:

«Вывяз савецкага лесу ў Англію расьце, напэўна, за кошт польскай лясной прамысловасьці. Савецкае гандлёвае прадстаўніцтва ў Данцыгу было ў апошні час рэарганізавана. У Данцыг прыяжджае новы гандлёвы прадстаўнік Грэфэльд, які спэцыяльна паклапоціцца, каб абярнуць Данцыг ў адпаведны транзытны пункт для расійскага экспарту ў Англію і іншыя краіны».

А. РЖЭВУСКІ.

„Гвозд“ вясеньняй праграмы

Ангельскія цьвёрдалобыя перад выбарамі аднавілі фабрыку па вытворчасьці «бальшавіцкай небясьпекі».

«И днем и ночью кот ученый
Все ходит по цепи кругом».

В фашысцкай Польшчы

ВАРШАВА, 16. Польскае тэлеграфнае агэнцтва паведамляе: «Пілсудзкі 16 красавіка прыняў былога прэм'ера Бартэля і ўходзячых у адстаўку членаў яго габінэту, а таксама ўноў назначанага старшыню рады міністраў Сьвітальскага і ўсіх членаў новага ўраду. У сваёй прамове Пілсудзкі адзначыў заслугі Бартэля, падкрэсьліўшы асабліва, што дзякуючы яго намаганьням тэхніка працы польскага ўраду ўзьнялася на высокі ўзровень, які ня ўступае ўзроўню лепшых сучасных дзяржаў.

Адказваючы Пілсудзкаму, Бартэль заявіў, што ён супольна з калегамі служыў грамадзкай справе, згодна ўказаньням маршала Пілсудзкага, які ўсімі разглядаецца, як кіраўнік нацыі. Заканчваючы сваю прамову, Бартэль заявіў маршалу:

«Я заўсёды ваш падуладны чыноўнік, салдат і памоцнік».

Напад на камдэпутата Керузальскага

ВАРШАВА, 16. У часе мітінгу, скліканага камуністычным дэпутатам сойму Керузальскім у цьмнавай фабрыцы ў Дамброве, пераздзетыя агэнты паліцыі накінуліся на Керузальскага і моцна яго пабілі. («Газ. Варш.»).

Назначэньне Чэховіча

ВІЛЬНЯ, 16. Былы міністар фінансаў Чэховіч назначаецца старшынёю фінансавае рады пры міністэрстве фінансаў. З прычыны гэтага будзе зьменены рэгляамент, які патрэбуе, каб старшынёю фінансавае камісіі быў сам міністар фінансаў. («Сл.»).

Назначэньне Чэховіча зьяўляецца новым выклікам пілсудчыкаў Сойму, які аддаў Чэховіча пад суд дзяржаўнага трыбуналу за перавышэньне бюджэту.

У чым абвінавачваюцца падробнікі анты-савецкіх фальшывак

БЭРЛІН, 16. Пракуратура сфармулявала абвінавачаньне на справе берлінскай фабрыкі анты-савецкіх фальшывак. Арлоў і Сумарокаў абвінавачваюцца ў замаху на ашуканства ў адносінах да карэспандэнта газэты «Нью-Ёрк Іўнінг Пост» і ў ашуканстве ў 8-мі выпадках, пры якіх яны апэравалі фальшывымі «лістамі Трылісэра».

Акрамя таго, пракуратура пастанавіла ўзьняць супроць Арлова і Сумарокава абвінавачаньне ў падлогу, бо Арлоў «падазраецца» у тым, што ён быў кіраўніком фабрыкі фальшывак, «якая пусьціла ў ход рад дакумантаў, выклікаўшых дыплёматычныя ўскладненьні». Пытаньне аб «сфальшаваньні лісту Зіноўева» не закранаецца актам абвінавачаньня. (ТАСС).

Бунт на латвійскім параходзе

БЭРЛІН, 16. Як падаюць газэты на барту латвійскага параходу «Крывс» выбухнуў бунт. Матросы ўварваліся ў капітанскую каюту і разграмілі яе. Некаторых ўдзельнікаў паліцыя даставіла на бераг сілай. Яны перададны ў распараджэньне латвійскага консульства ў Штэціне. (ТАСС).

Сяўба на поўдні Саюзу ў поўным разгары

РАСТОЎ-ДОН, 16. У Нова-Кулакоўскім сельсавеце, Тэрскае акругі, трактарная калённа Хлебасаюзу ў складзе 30 трактараў у працягу 10 дзён выравіла 1.775 гэктараў бядняцкіх надзелаў. Калённа працуе каля 20 гадзін у суткі пры начным асьвятленьні ліхтарамі «Лятучая Мыш». Рулявымі працуюць 80 чалавек-сялян, у большасьці кабардзінцы і нагайцы пад кіраўніцтвам мэханіка і трох брыгадзіраў, адзін з якіх кабардзінка-вылучэнка. Дзякуючы калённе плошча пасеваў пашыраецца ў тры разы. Усяго калённа апрацуе 10 тысяч гэктараў зямлі, большасьць якой 20 год пуставала. У раёне, дзе працуе трактарная калённа, ужо арганізавалася 5 калгасаў і 3 пасеўныя таварыствы, якія аб'ядноваюць 709 бядняцкія гаспадаркі.

* * *

РОСТАЎ, 16. Сяўба ў саўгасе «Гігант» у поўным разгары. Пачалося спаборніцтва наміж паасобнымі трактарнымі калённамі. Рабочыя парапышы каласьці ўсе сілы, каб выканаць заданьне па спаборніцтвах—засеяць за 10 дзён 48 тысяч гэктараў.

Сеюць таксама ў паўднёвых саўгасах Паўночна-Каўказкага сельтрэсту, які прыняў выклік «Гіганта». Трэст паставіў сабе задачай засеяць 27 тысяч гэктараў супроць 20 тысяч гэктараў мінулага году.

Трактарная станцыя трэсту ў Армавірскай акрузе таксама ўступіла ў спаборніцтва. 80 трактараў выехалі на поле сялян, арганізаваўшыхся ў калгасы. Краявы калгассаюз прыняў выклік «Севкавсельтреста» на спаборніцтва. Калгассаюз абавязаўся павялічыць пасеўную плошчу калгасаў на 60 проц.

РАЗГУЛ БАЯРСКАГА ТЭРОРУ Ў РУМЫНІІ

Замах улады на нярухомую маемасьць прафсаюзаў

ВЕНА, 16. Па загаду румынскага міністра ўнутраных спраў у апошнія дні апячатаны памяшканьні ўнітарных прафсаюзаў у Кляўзэнбэргу і Плоэшці а таксама рабочыя дамы ў Тэргумурэшы, Арадзе і Краштаце. 13-га красавіка ў Бухарэсьце апячатана рэдакцыя органу рабоча-сялянскага блёку «Інфантэ». Чарговы нумар газэты быў канфіскаваны. У Кішынёве забаронена рабочасялянская газэта «Правда», у Арадзе—рабочая газэта—«Віраджэт».

«Унівэрсул» падае, што ў Бухарэсьце рабочыя прабавалі сарваць пачаткі з дому прафсаюзаў, але жандармерыя перашкодзіла гэтаму. Карэспандэнт газэты піша, што ўлада намерана канфіскаваць нярухомую маемасьць прафсаюзаў, якая ацэньваецца ў 20 млн. лей. (ТАСС).

* * *

ВЕНА, 16. Як пішуць з Бухарэсту рабоча-сялянскі блёк і ўнітарныя прафсаюзы спрабавалі 14 красавіка наладзіць сход-пратэсту супроць прасьледваньняў рэвалюцыйнага рабочага руху. Паліцыя акружыла памяшканьне, дзе адбываўся сход, і рэгінала сход, спасылаючыся на існуючую забарону. Затрымана 78 удзельнікаў сходу, 7—з іх заставулены пад вартаю.

Старшыняарады ўнітарных прафсаюзаў Грофу пры сьмерці

ВЕНА, 19. Як паведамляюць з Бухарэсту, румынскія газэты абвяргаюць чуткі аб сьмерці старшыні рады ўнітарных прафсаюзаў Грофу, які быў цяжка паранены ў часе нападу паліцыі на дом прафсаюзаў у Тамешвары. Грофу знаходзіцца ў больніцы пры сьмерці. (ТАСС).

III АКРУГОВЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ МЕНСКАЙ АКРУГІ

АДЧЫНЕНЬНЕ ЗЬЕЗДУ

Учора, у клюбе імя Карла Маркса адбылося ўрачыстае адчыненьне III акруговага зьезду саветаў Менскай акругі.

На зьезд прыбыло 454 дэлегатаў.

Старшыня Менскага АВК т. Яцкевіч, адчыняючы зьезд, спыніўся на тых задачах, якія павінны быць вырашаны зьездам. Абраны прэзыдыум зьезду з 48 чалавек.

У склад прэзыдыуму ўваходзяць т.т. Чарвякоў, Гамарнік, Славінскі, Галадзед, Крузмат, Аксючыц, Васілевіч, Карп, Ягораў і інш.

Ад імя ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР выступіў з прывітаньнем т. Чарвякоў.

— ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР, —кажа т. Чарвякоў,—даручылі мне перадаць вам наказ, які павінен служыць паставай для далейшай вашай працы. Да гэтых галоўных задач адносяцца: далейшы тэмп індустрыялізацыі краіны, разьвіцьцё і рэканструкцыя сельскай гаспадаркі і далейшае разгортваньне культурнай рэвалюцыі.

Тав. Славінскі, вітаючы зьезд ад імя Менскага акружкому партыі, адзначыў, што камуністычная партыя карыстаецца падтрыманьнем з боку шырокіх рабочых і бядняцка-серадняцкіх сялянскіх мас.

У адказ на некаторыя цяжкасьці, якія перажывае краіна, рабочая кляса адказала сацыялістычным спаборніцтвам прадпрыемстваў па падняцьці вытворчасьці, а сялянства—калектыўнай здачай хлеба.

Камандуючы Беларускай Вайсковай Акругай т. Ягораў у сваім прывітаньні адзначыў:—Палітыка савецкай улады —палітыка міру. Але калі вораг пасьмее напасьці на савецкую краіну, ён спаткае з боку чырвоных палкоў рашучы адпор.

Ад імя прафэсыянальных саюзаў зьезд вітаў т. Рыжоў.

Акрамя гэтага, зьезд віталі прадстаўнікі заводаў «Камунар», «Меншвэо», «Дрэваапрацоўчнік» і інш.

Зьезд заслухаў рапарт № падшэфнага беларускага палка.

З адказам на прывітаньні выступіў т. Аксючыц.

Зьездам пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б)Б, ЦК КП(б)Б, ЦВК СССР, ЦВК і СНК БССР і цэнтральнаму партыйнаму органу ЦК КП(б)Б—рэдакцыі газэты «Зьвязда».

Заява намесьніка наркома замежных спраў Карахана пэрсыдзкаму паслу

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ТАСС: У зьвязку з некаторымі акалічнасьцямі, якія ўказваюць на трывожнае становішча на пэрсыдзка-аўганскай граніцы, намесьнік народнага камісара па замежных справах Карахан прыняў 16-га красавіка надзвычайнага і паўнамоцнага пасла Пэрсыі ў Маскве Алі-Голі-Хана Аскары. Карахан перадаў пэрсыдзкаму паслу заяву, у якой адзначыў, што намер некаторых пэрсыдзкіх «олаў пад выглядам барацьбы з бандытызмам акупаваць частку Аўганскай тэрыторыі мела-б самыя цяжкія вынікі для самой Пэрсіі, паставіўшы яе ў рады ворагаў незалежнасьці дзяржаў Усходу і ізаляваўшы яе ад апошніх. У прадстаўленьні было адзначана, што ўрад СССР ня можа застацца пасыўным да спробы парушыць незалежнасьць Аўганістану і зварачаецца да пэрсыдзкага ўраду, каб ён прыняў меры супроць плянаў безадказных колаў Пэрсыі ў адносінах да Незалежнасьці Аўганістану.

Адначасова народным камісарыятам замежных спраў пасланы інструкцыі паўнамоцнаму прадстаўніцтву СССР у Тэгэране аб аналёгічным прадстаўленьні непасрэдна пэрсыдзкаму ўраду. (ТАСС).

Адозва ЦК кампартыі Баўгарыі

ВЕНА, 3. Венская «Ротэ Фанэ» друкуе адозву ЦК кампартыі Баўгарыі да міжнароднага пралетарыяту. У адозве ўказваецца, што новы паход баўгарскага фашысцкага ўраду супроць кампартыі, які выявіўся ў арыштах выдатнага працаўніка партыі Младэна Станянава і раду іншых членаў кампартыі, зьяўляецца праяўленьнем фашысцкай палітыкі, накіраванай да таго, каб перашкодзіць уздыму рабочых мас і іх радыкалізацыі і «ізаляваць» рух ад кіруючага ўплыву нелегальнай кампартыі. У адозьве зазначаецца далей, што мыцьцё Станянава знаходзіцца ў небясьпецы. Афіцыйным паведамленьнем аб замаху Станянава на самагубства ўрад хоча замазаць свае намеры задушыць пралетарскага барацьбіта. У сувязі з гэтым адозва заклікае міжнародны пралетарыят арганізаваць кампанію пратэсту супроць новых арыштаў, бярбарскіх катаваньняў і зьдзекаў рабочых і сялян у Баўгарыі.

„Нью-Ёрк Гэральд“ аб англа-амэрыканскіх супярэчнасьцях

ПАРЫЖ, 10. «Нью-Ёрк Гэральд» ў перадавой парыскага выданьня спыняецца на пытаньні аб магчымасьці вайны паміж Англіяй і Амэрыкай. Па словах газэты, пара перастаць называць ангельска-амэрыканскую вайну «нямыслімай». Цяпер аб ёй ня толькі думаюць, але гавораць і пішуць.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Партыйныя ячэйкі рыхтуюцца да генэральнай чысткі

На агульных адкрытых сходах абмяркоўваюцца палітычныя задачы, формы і мэтады правядзеньня чысткі

ПРАВЕРЫЦЬ КОЖНАГА КАМУНІСТАГА, ЯК ЁН ЗМАГАЕЦЦА ЗА КЛЯСАВЫЯ ПРАЛЕТАРСКІЯ ПАЗЫЦЫІ, ЯК ЁН НА СПРАВЕ ПРАВОДЗІЦЬ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

Пра падрыхтоўку да чысткі ў вытворчых ячэйках

Папершае, каб забясьпечыць удзел у правядзеньні чысткі з боку перадавых беспартыйных рабочых на фабрыках і заводах, трэба правесьці адкрытыя сходы цэхавых ячэек, прысьвечаныя пытаньням чысткі, на якія шырока прыцягнуць беспартыйны рабочы актыў. Гэтыя сходы адначасова трэба выкарыстаць і ў мэтах вярбоўкі ў партыю лепшых перадавых пралетараў, якія маюць вялікі вытворчы стаж, якія паказалі сябе, як сапраўды стойкія, адданыя справе пралетарыяту элемэнты. Побач з растлумачэньнем палітычных задач чысткі рабочым масам на сходах цэхавых ячэек трэба шырока выкарыстаць і мэтады групавой і індывідуальнай агітацыі.

Ставячы пытаньне і ажыцьцяўляючы на справе ўдзел рабочых мас у чысткі партыі, асабліва трэба зьвярнуць увагу на тое, каб асобныя камуністы не пляліся ў хвасьце адсталых груп рабочых. Адсталыя рабочыя, тыя, што нядаўна прышлі на вытворчасьць з вёскі ці з асяродзішча саматужнікаў, бязумоўна, з-за сваіх вузка-цэхавых інтарэсаў могуць выкарыстоўваць чыстку для таго, каб зьвесьці асабістыя рахункі з тымі камуністымі, якія выразна праводзяць партыйную лінію, якія змагаюцца супроць рвацкіх, вузка-цэхавых настрояў адсталых рабочых. Гэтым асобным колам рабочых, нядаўнім выхадцам з дробна-буржуазнага асяродзішча, часта не па «душы» пастаўленыя партыяй задачы па ўзьнімае працоўнай дысцыпліны, па павышэньні якасьці прадукцыі і г. д. і таму адсталыя рабочыя будуць прабаваць у пэрыяд чысткі партыі накіраваць сваю незадаволенасьць супроць тых, хто на практыцы змагаецца за ажыцьцяўленьне гэтых задач партыі. **Такім настроям ячэйкі павінны даць належны адпор.**

Могуць быць выпадкі, калі яўна варожыя элемэнты, якія, замаскаваўшыся, трымаюцца на вытворчасьці, былыя трацкісты, выпаныя з партыі, паспрабуюць выкарыстаць чыстку ў мэтах дыскрэдытацыі партыі і партыйнага кіраўніцтва. Ячэйкі павінны памятаць, што ў крытыцы з боку вораг'ей партыі будзе часамі цмат «левых» фраз і тут трэба ўмець тонка распазнаваць твар ворага партыі.

Другое—складаньне характарыстык на цэхавыя ячэйкі. Памойму, пры складаньні характарыстык на цэхавыя ячэйкі трэба выходзіць з наступных момантаў: першае—як ячэйка кіруе прывадзнымі пасамі (прафарганізацыя, вытворчая нарада, камсамол, добраахвотныя таварыствы); другое — як ячэйка змагла згуртаваць масы наўкола асноўных задач партыі (рацыяналізацыя вытворчасьці, узьняцьце працоўнай дысцыпліны, зьніжэньне сабекошту прадукцыі і г. д.); трэцяе—даць аналіз унутрыпартыйнага стану ячэйкі. Мне здаецца, што вось гэта кола пытаньняў павінна легчы ў аснову апэнкі работы і стану цэхавай ячэйкі. Для складаньня характарыстык трэба шырока выкарыстаць матар'ялы апошніх абсьледваньняў, матар'ялаў па правэрцы выкананьня партыйных дырэктыў гэтымі ячэйкамі і інш.

Нарэшце, аб тым, як правесьці чыстку ў буйных парткалектывах, каб яна прайшла ў найбольш кароткі тэрмін. Тут трэба быць-б паставіць пытаньне аб тым, каб у буйных парткалектывах фабрык і заводаў у часе чысткі вялі працу дзьве ці некалькі праверачных камісій. Інакш чыстка ў такіх калектывах зацягнецца на доўгі пэрыяд, што вельмі непажадана.

А—нскі П.

Праведзена чыстка Сураскай арганізацыі ЛСКМБ

Чыстка зрабіла арганізацыю здаровай і прадаздольнай

(Віцебшчына)

Некалькі часу таму назад на старонках друку паведамлялася аб роспуску Сіманаўскай ячэйкі ЛКСМ (Сураскі раён), з прычыны яе засьмечанасьці.

У Сураскім раёне гэтымі днямі закончыла работу камісія ЦК ЛКСМБ, якая правяла чыстку камсамольскай арганізацыі ад чужога элемэнту.

Чыстка прайшла пры шырокім удзеле рабочай моладзі, беднаты і батрацтва. Гэтаму спрыяла праведзеная напярэдадні работа райкомам і партыйнымі парт'ячэйкамі. Спачатку праводзіліся сходы камсамольскіх ячэек з удзелам беспартыйнай моладзі. На 16-ці сходах прысутнічала 235 камсамольцаў і 228 беспартыйных. Выказалася 169 чалавек, з іх на долю беспартыйных падае 43 выступленьні.

Чыстку прабавалі скарыстаць у сваіх мэтах кулакі. На адкрыты сход Казанаўскай ячэйкі зьявілася валікая колькасьць кулацкай моладзі, якая патрабавала ў сваіх выступленьнях роспуску ячэйкі, абараняючы камсамольцаў, зьвязаных з кулакамі. На сход Запасьлскай ячэйкі пралезла некалькі кулакоў, адбіўшых у сваіх выступленьнях сваю нянавісьць да беднаты і батрацтва. Аднак, батрацкая і бяднацкая беспартыйная моладзь дала рэзкі адпор абнаглеўшай кулацкай вграі.

У часе праверкі выявілася значная слабасьць палітыка-выхаваўчай работы. Хаты-чытальні, чырвоныя куткі ў некаторых сельсаветах зьяўляліся часта для бескарыснага правядзеньня часу.

На жаль, ня толькі вясковы камсамолец, але нават асобныя члены ячэйкі фабрыкі імя Вароўскага давалі дрэнны прыклад беспартыйнай частцы моладзі. Так, члены гэтай ячэйкі Івіноў і Бабаеў пашлі ў суседнюю вёску, напіліся, нахуліганілі, выбілі ў адной хаце вакно.

Аб палітычным узроўні асобных камсамольцаў можна судзіць па адказах некаторых камсамольцаў на пытаньні камісіі ЦК. Ні на адно элемэнтарнейшае пытаньне камсамольцы не далі правільнага адказу і г. д.

У выніку праведзенай камісіяй работы вычышчана з камсамолу 63 чалавекі, што складае 23 проц. усёй Сураскай камсамольскай арганізацыі. Большасьць выключаных: заможныя элемэнты, двоці кулакоў, гандляроў, саматужнікаў і інш.

Я.

У час чысткі вербаваць перадавых рабочых у партыю

(Фрунзаўскі раён, Менск)

На адкрыты сход ячэйкі КП(б)Б Менскай фабрыкі абутку, на якім абмяркоўваліся тэзісы тав. **Яраслаўскага**, прышло шмат беспартыйных рабочых.

Выступаўшыя ў спрэчках таварышы ўносілі рад практычных прапаноў па пытаньнях чысткі.

— Пры чыстцы, — кажа работніца **Шнейдэр**, зв вясковымі ячэйкамі трэба пільна сачыць, каб ня было момантаў замазваньня хваравітых зьявішч у рабоце ячэек.

— Ня толькі чысьціць, але і вербаваць у партыю лепшых рабочых ад варштату.

Замест аднаго вычышчанага мы павінны завербаваць у партыю ня менш трох рабочых,—кажа т. **Палякоўскі**.

— Некаторыя камуністы, працуючыя на вытворчасьці, абзаяліся гаспадаркамі і падпалі пад уплыў дробна-буржуазнай ідэалёгіі. На гэтых партыйцаў,—кажа т. **Алой**,—трэба зьвярнуць вялікую ўвагу пры чыстцы.

— Выганяць з партыі хабарнікаў і бюракратаў,—кажа ў сваёй прамове рабочы **Каган**.

Ва ўхваленай рэзалюцыі сход аднагалосна поўнасьцю ўхваліў тэзісы т. Яраслаўскага.

Дырэктывы аб рабоце сярод беднаты ня выконваюцца

(Расонскі р., Полаччына)

Раённая канфэрэнцыя груп беднаты, якая нядаўна праведзена райкомам партыі, паказала, што актыўнасьць і клясавая сьвядомасьць беднаты ўзрасла. Па дакладах аб чыстцы савецкага апарату і аб веснавой пасеўнай кампаніі выказалася 20 чал. Выступаўшыя прапановалі мерапрыемствы па падрыхтоўцы да сяўбы, далі рад канкрэтных прапаноў аб тым, як найлепш правесьці чыстку апарату. Усе выступленьні былі вельмі дзелавыя. Характэрна тое, што сабесаўскія настроі, якія раней мелі месца сярод некаторай часткі беднаты, зараз адсутнічаюць. Кулак зараз падрабляецца пад бедняка. Гэта выяўлена і на канфэрэнцыі, дзе былы гандляр Крэмэр зараз прабаваў зрабіць вылазку на канфэрэнцыі з крытыкай усёй работы саветаў і партыі, «работа ўся на паперы, а на справе нічога няма, і ніякая крытыка работы саветаў і ўдзел беднаты непатрэбен і не дапаможа». Удзельнікі канфэрэнцыі расшыфравалі гэтага «бедняка» і далі яму адпор.

Адносна работы сярод беднаты трэба сказаць, што яна ў раёне пастаўлена слаба. Пры каапэратывах групы беднаты не арганізаваны. Дырэктывы АК КП(б)Б па рабоце сярод беднаты ў ячэйках не прапрацаваны, таму ячэйкі ня ведаюць арганізацыйных форм работы. Даная райканфэрэнцыя адбылася пасьля двухразовага зрыву. Прысутнічала на ёй усяго 27 чал., а павінна было зьявіцца 112 чал. Падрыхтоўчая работа да канфэрэнцыі па сельсаветах не праводзілася.

Пл. Баз.

За абмеркаваньнем пытаньняў чысткі

(Ячэйка КП(б)Б заводу „Энэргія")

Пытаньне аб чыстцы партыі прыцягнула на адкрыты сход партыйная ячэйка шмат беспартыйных рабочых. Даклад зрабіў сакратар райкому тав. **Конюхаў**.

Ці патрэбны бытавыя камісіі?—Вось пытаньне, вакол якога разгарнуліся гарачыя спрэчкі.

— Такія камісіі, якія займаюцца «высьледжваньнем» камуністых, непатрэбны,—кажа т. **Пішчынаў**. Аднак т. Пішчыкаў лічыць, што бытавая камісія, якая была створана пры ячэйцы заводу «Энэргія», займалася карыснай справай. Яна існавала пры АПА камісіі і ячэйкі і займалася ня «высьледжваньнем», а праверкай стану партвучобы, пасьпяховасьці партыйцаў у палітасьвеце, прыглядалася да паводзін камуністых на вытворчасьці і г. д. Такія камісіі, на думцы т. Пішчыкава, патрэбны.

— Ніякіх камісій стварыць ня трэба, —кажа т. **Райцэс**.—Камісія толькі пашкодзіць справе чысткі. Чыстка партыі павінна падрыхтоўвацца непасрэдна бюро ячэйкі.

Думка тав. Райцэса была падтрымана радам таварышоў.

Галасаваньнем ячэйка пастанавіла ніякіх камісій па падрыхтоўцы да чысткі партыі не стварыць.

У іншых выступленьнях па дакладу т. Конюхава прамоўцы адзначалі своячасовасьць і важнасьць чысткі радоў партыі.

С.

Праверыць кожнага камуністага, наколькі ён прыкладны на вытворчасьці

(Ячэйка КП(б)Б заводу „Дрэва-апрацоўшчык")

На сходзе, дзе па пытаньні чысткі партыі рабіў даклад сакратар райкому партыі тав. **Гурэвіч**, прысутнічала шмат камсамольцаў і беспартыйных рабочых.

Па дакладу разгарнуліся спрэчкі, прымалі ўдзел ня толькі партыйцы, а і беспартыйныя рабочыя. У сваім выступленьні рабочы т. **Лупач** сказаў:

— Вычысьціць з партыі бюракратаў і падкулачнікаў будзе ня цяжка. Мы павінны ня толькі выяўляць і гнаць з партыі тых, што прымазаліся, але праверыць і тых, хто нядбайна выконвае свае партыйныя і грамадзкія абавязкі. У сваёй прамове т. Лупач паказвае на моманты, якія сьведчаць аб тым, што на заводзе пануе цэхаўшчына і рвацкія настрої сярод асобных груп рабочых, што некаторыя партыйцы плятуцца ў хвасьце і патураюць рвачом і прагульшчыкам.

На заводзе рабочымі ўнесен рад каштоўных вытворчых прапаноў, аднак, ні адна прапанова ня выканана.

— Камуністы—гаспадарчыя працаўнікі, якія скрозь пальцы глядзяць на прапановы рабочых і падрываюць рабочую ініцыятыву, кажа т. Каплан, зьяўляюцца па сутнасьці бюракратамі. Пры чыстцы да такіх камуністых трэба адносіцца жорстка.

Выступіўшы ў спрэчках тав. **Школьнікаў** спыніўся на тым, што сур'ёзна трэба падыйсьці да выхадпаў з іншых партый. У праверачную камісію ад заводу райкомам намячаюцца два камуністы.

На гэтым сходзе ячэйка абгаварыла гэтыя кандыдатуры і сказала: намечаныя таварышы добрыя, вытрыманыя, надзейныя камуністы, ім можна даручыць работу на чысткі. Як быць з бытавымі камісіямі? Ці патрэбны яны пры правядзеньні чысткі? Гэтым пытаньнем асабліва зацікавіліся ўсе прысутныя. Сход выказаўся за тое, што яны непатрэбны.

Пастанова Парткалегіі ЦКК КП(б)Б

па справе рабкора Казлова

Інфармацыю Віцебскай АКК КП(б)Б аб тым, што заява члена партыі тав. Казлова аб ганьбеньні на яго, як рабкора, не пацьвердзілася,—прыняць да ведама.

Аднак, зьвярнуць увагу Віцебскай АКК на недапушчальнасьць кваліфікацыі факту звароту т. Казлова в заявай у ЦБК і рэдакцыі газэт, як непадпарадкаваньне з яго боку пастанове РК КП(б)Б. *Растлумачыць АКК, што зварот членаў партыі ў вышэйшы парторган ня можа разглядацца, як парушэньне партдысцыпліны.*

ПЯЦІГАДОВЫ ПЛЯН РАЗЬВІЦЬЦЯ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ

Тэзісы дакладаў т. т. РЫКАВА, КРЖЫЖАНОЎСКАГА і КУЙБЫШАВА да XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі, ухваленыя Палітбюро ЦК УсеКП(б)

I.

1) Заслухаўшы даклады аб пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, XVI усесаюзная партканфэрэнцыя ўстанаўляе, папершае, што пяцігадовы плян у адносінах агульнага росту народнае гаспадаркі прадугледжвае наступныя дасягненьні:

а) У той час, як агульная сума капітальных укладаньняў у пяцігодку 23-24—27-28 г. г. складала 26,5 млрд. руб., для пяцігодкі 28-29—32-33 г. г. разьмер капітальных укладаньняў ва ўсю народную гаспадарку вызначаны ў суме 64,6 млрд. руб. У той час, як за мінулую пяцігодку капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць складалі 4,4 млрд. руб., для праектуемае пяцігодкі яны вызначаны ў 16,4 млрд. руб.; адпаведныя лічбы для сельскае гаспадаркі складаюць 15 млрд. руб. і 23,2 млрд. руб.; для транспарту 2,7 млрд. руб. і 10 млрд. руб. і для электрыфікацыі 0,9 млрд. руб. і 3,1 млрд. руб.

б) У выніку гэтых укладаньняў агульная сума асноўных фондаў краіны з 70 млрд. у 1927-28 г. вырасьце да 128 млрд. руб. у 32-33 г., г. зн. на 82 проц., у тым ліку асноўныя фонды ўсёй прамысловасьці—з 9,2 млрд. да 23,1 млрд. руб., электрыфікацыі—з 1 млрд. руб. да 5 млрд. руб., г. зн. у 5 раз, чыгуначнага транспарту—з 10 млрд. руб. да 17 млрд. руб., г. зн. на 70 проц., і сельскае гаспадаркі—з 28,7 млрд. руб. да 38,9 млрд. руб., г. зн. на 35 проц.

в) Вялізны ахват капітальных укладаньняў ідзе побач з адпаведным ростам прадукцыі ва ўсёй прамысловасьці з 18,3 млрд. руб. у 1927-28 г. да 43,2 млрд. руб. у 32-33 г., што азначае больш, чым патраенае даваенных разьмераў прамысловай прадукцыі. У сельскай гаспадарцы—з 16,6 млрд. руб. да 25,8 млрд. руб., што азначае перавышэньне даваенных разьмераў сельска-гаспадарчай прадукцыі больш, чым у паўтары разы. Работа чыгунак узрасьце з 88 млрд. тона-кілёмэтраў да 163 млрд. тона-кілёмэтраў. Чыстая прадукцыя (па фізычным ахваце) усяе народнае гаспадаркі—з 24,4 млрд. руб. да 49,7 млрд. руб.

г) Выходзячы з агульнае ідэі індустрыялізацыі краіны, узмацненьня абаро наздольнасьці Саюзу і вызваленьня ад залежнасьці ў адносінах капіталістычных краін, капіталькладаньні ў прамысловасьць накіроўваюцца пераважна на прамысловасьць, якая **вырабляе сродкі вытворчасьці** (78% усіх капітальных укладаньняў у прамысловасьць), у адпаведнасьці з чым і прадукцыя гэтых галін прамысловасьці расьце значна шпарчэй: пры росьце ўсёй валавой прадукцыі плянуемае прамысловасьці ў 2,8 раз, валавая прадукцыя галін, што вырабляюць сродкі вытворчасьці, павялічваецца ў 3,3 разы.

Па электрабудаўніцтве плян прадугледжвае будаўніцтва 42 раённых электрацэнтраляў (Дняпроўская гідрастанцыя, Сьвірская гідрастанцыя, электрастанцыя на торфе на М. Вішэры, на падмаскоўным вугле ў Бобрыках, Зуеўская—у Донбасе і г. д., і г. д.). Гэта вялізнае будаўніцтва павінна павялічыць колькасьць электраэнэргіі з 5 мільярд кілёват-гадзін да 22 млрд. кілёватгадзін у канцы пяцігодкі.

Па чорнай мэталюргіі прадугледжваецца будаўніцтва новых магутных мэталюргічных заводаў (Магнітагорскі, Тэльбэскі, Дняпроўскі, Крываросскі і г. д.). Будаўніцтва новых заводаў і рэканструкцыя існуючых павінны давесьці прадукцыю чыгуну з 3½ мільёнаў тон да 10 млн. тон у 32-33 г.

Па каменным вугалі праектуецца магутнае будаўніцтва як у Донбасе, так і на Урале, Кузбасе і Падмаскоўным басэйне, прычым здабыча каменнага вугалю з 35 млн. у 27-28 г. павінна быць даведзена да 75 млн. тон у 32-33 г.

Рэканструкцыя і будаўніцтва новых заводаў у галіне машынабудаўніцтва (аўтамабільны завод, трактарныя заводы ў Сталінградзе і па Урале, Сьвярдлоўскі завод цяжкога машынабудаўніцтва. Растоўскі завод с.-г. машынабудаўніцтва, інструментальныя заводы і г. д. і г. д.) даюць магчымасьць намеціць узрастанне валавой прадукцыі машынабудаўнічай прамысловасьці ў 3½ разы, а прадукцыі сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва ў 4 разы.

Па хэмічнай прамысловасьці намячаецца будаўніцтва хэмічных камбінатаў (Веразьнякоўскі, Маскоўскі на ягор'еўскіх фасфарытах, у Донбасе і г. д.), прычым выраб хэмічных угнаеньняў у 32-33 г. даводзіцца больш як да 8 мільёнаў тон супроць 235 тыс. тон у 27-28 г.

д) Значнае перавышэньне запраектаваных тэмпаў разьвіцьця гаспадаркі Савецкага Саюзу ў параўнаньні з усімі капіталістычнымі краінамі ўжо к канцу пяцігодкі павінна будзе істотна зьмяніць удзельную вагу СССР у сусьветнай вытворчасьці—па чыгуне СССР з шостага месца перасунецца на трэцяе (пасьля Нямеччыны і Злучаных Штатаў), па каменным вугалі—з пятага месца на чацьвертае (пасьля Злучаных Штатаў, Англіі і Нямеччыны).

2) Канфэрэнцыя ўстанаўляе, падругое, што агульны рост народнае гаспадаркі прадугледжваецца пяцігадовым плянам у кірунку **рашучага росту сацыялістычнага сэктару** ў горадзе і вёсцы за кошт капіталістычных элемэнтаў народнае гаспадаркі, што відаць з наступных даных:

а) Структура асноўных фондаў зьмяняецца (у процантах да выніку к канцу году):

Сэктары		1927-28 г.	1932-33 г.
Дзяржаўны)	сацыялістычны	51,0	63,6
Каапэрац.)		1,7	5,3
Прыватны . . .		47,3	31,1

б) Адпаведна гэтаму зьмяняецца ўдзельная вага ў валавой прадукцыі сацыялістычнага сэктару:

На прамысловасьці . .	80 проц.	92 проц.
„ сельск. гаспадарцы	2 „	16 „
„ разробн. звароце	75 „	91 „

Асаблівы зрух дае будаўнічая праграма аграмаджанага сэктару (саўгасаў і калгасаў) у сельскай гаспадарцы. Рост пасеўных плошчаў аграмаджанага сэктару сельскае гаспадаркі даходзіць да канца пяцігодзьдзя да 27 млн. гэктараў пасеўнай плошчы, складаючы 18 проц. агульнай пасеўнай плошчы і забясьпечваючы 16 проц. валавой прадукцыі і 43 проц. таварнай прадукцыі збожжавых культур. Індывідуальны сэктар сельскае гаспадаркі спыняе свой колькасны рост з прычыны павялічэньня насельніцтва, якое праектуецца, уцягнутага ў аграмаджаны сэктар да 21 млн. душ, прычым дзяржаўныя саўгасы (старыя і новыя) у 1932 годзе даюць прадукцыю ня менш 28 міл. цэнтнэраў таварнага хлеба, а калгасы—ня менш 39 млн. цэнтнэраў, што складае 67 млн. цэнтнэраў, г. зн. звыш 400 млн. пудоў таварнага хлеба.

б) Важнейшыя паказальнікі росту каапэраваньня даюцца наступным процістаўленьнем:

	1927-28 г.	1932-33 г.
1) Доля валавой прадукцыі калгасаў .	1 проц.	11,8 проц.
2) Доля прадукцыі дробнай каапэраванай прамысловасьці ва ўсёй прадукцыі дробнай прамысловасьці . . .	19,4 проц.	58,8 проц.
3) Каапэраваньне раздробнага тавараабароту	60,2 проц.	78,9 проц.
4) Колькасьць гаспадарак с.-г. каапэрацыі	9,5 млн. (37,5 проц. усіх гас.)	23,58 млн. (85 проц. усіх гас.)
5) Колькасьць (у м. пайшчыках) каапэраванага спажывец. каапэрацыяй насельніцтва ў горадзе .	8,7 млн. пайшч.	16,5 млн. пайшч.
6) Колькасьць (у м. пайшч.) каапэраванага спажывец. каапэрацыяй насельніцтва на сяле .	13,9 млн. пайшч.	31,8 млн. пайшч.

Гэта значнае ўзмацненьне сацыялістычных элемэнтаў ва ўсёй народнай гаспадарцы, у вытворчасьці і тавараазароце пры разьвіцьці сеткі машынатрактарных станцый і шырокай практыкі кантрактацыі, якая ахопіць да канца пяцігодкі 85 проц. збожжавых культур, азначае ўмацаваньне кіруючай ролі рабочае клясы і стварае новую форму змычкі гораду і вёскі, якая вядзе да масавай перабудовы сельскае гаспадаркі на аснове вышэйшай тэхнікі і калектывізацыі.

3) Канфэрэнцыя ўстанаўляе, патрэбнае, што:

а) **Народны даход** вырастае ў нязьменных цэнах з 24,4 млрд. руб. у 1927-28 г. да 49,7 млрд., г. зн. на 103 проц. Гэта дае штогадовы прыроост народнага даходу больш, чым на 12 проц.

б) **Сацыяльную структуру** народнага даходу перш за ўсё характарызуе ўздым рэальнай заработнай платы прамысловых рабочых к канцу пяцігодзьдзя на 71 проц., прычым удзельная вага даходу ўсяе рабочае клясы ў адносінах да ўсяго даходу народнае гаспадаркі павялічваецца з 32,1 проц. да 37 проц. Даходы-ж усяго земляробчага насельніцтва ўзрастаюць к канцу пяцігодзьдзя на 67 проц. пры памяншэньні, у зьвязку з узмоцненым ростам індустрыі, удзельнае вагі гэтых даходаў ва ўсім народным даходзе з 49,8 проц. да 42,5 проц.

в) **Рост зводнага бюджэту** (нэтто) характарызуецца тым, што агульная сума бюджэту ў надыходзячай пяцігодцы будзе складаць 51 млрд. рублёў супроць 19 млр. мінулага пяцігодзьдзя (рост на 166,7 проц.). Пры гэтым у адносінах да народнага даходу ў 1932-33 г. бюджэт будзе складаць 30,9 проц. супроць 25,9 проц. у 1928-29 г. Гэты рост бюджэту дае, побач з умацаваньнем абароназдольнасьці краіны, магчымасьць павялічэньня фінансаваньня народнае гаспадаркі за надыходзячае пяцігодзьдзе амаль у чатыры разы (393 проц.) параўнальна з мінулым пяцігодзьдзем, і рост сацыяльна-культурных выдаткаў амаль у тры разы (276 проц.).

г) Пяцігадовы плян прадугледжвае значны рост **як таварных, так і валютных рэзэрваў.**

II.

Выходзячы з паказаных вышэй даных аб пяцігадовым пляне і прымаючы пад увагу, што гэты плян вусім забясьпечвае:

а) максымальнае разьвіцьцё вытворчасьці сродкаў вытворчасьці, як асновы індустрыялізацыі краіны;

б) рашучае ўзмацненьне сацыялістычнага сэктару ў горадзе і на вёсцы за кошт капіталістычных элемэнтаў у народнае гаспадарцы, уцягненьне мільённых мас сялянства ў сацыялістычнае будаўніцтва на базе каапэрацыйнай грамадзкасьці і калектыўнае працы і ўсямерную дапамогу бядняцка-серадняцкім індывідуальным гаспадаркам у іх барацьбе супроць кулацкай эксплёатацыі;

в) зжываньне празмернай адсталасьці сельскае гаспадаркі ад прамысловасьці і выравнаньне, у асноўным, збожжавай праблемы;

г) значны ўздым матар'яльнага і культурнага ўзроўню рабочае клясы і працоўных мас вёскі;

д) умацаваньне кіруючай ролі рабочае клясы на базе разьвіцьця новых форм вымчкі в асноўнымі масамі сялянства;

е) умацаваньне эканамічных і палітычных пазыцый пралетарскай дыктатуры ў яе барацьбе з клясавымі ворагамі як унутры краіны, так і па-за ёю;

ж) гаспадарчы і культурны ўздым нацыянальных рэспублік і адсталых раёнаў і абласьцей;

з) значнае ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны;

і) буйны крок наперад у справе ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі: дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны,—

канфэрэнцыя пастанаўляе ўхваліць пяцігадовы плян Дзяржаўнай Плянавай Камісіі ў яго аптымальным варыянце, зацьверджаны Саветам Народных Камісараў Саюзу ССР, як плян, які поўнасьцю адпавядае дырэктывам XV зьезду партыі.

III.

Ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну, які прадстаўляе праграму разгорнутага сацыялістычнага наступленьня, зьвязана з перамаганьнем вялікіх труднасьцяй унутранога і знадворнага парадку. Гэтыя труднасьці вынікаюць з напружанасьці самога пляну, абумоўленай тэхніка-эканамічнай адсталасьцю краіны, з складанасьці задачы рэканструкцыі шматмільённых распыленых селянскіх гаспадарак на базе калектыўнае працы, нарэшце, з абстаноўкі капіталістычнага акружэньня нашай краіны. Гэтыя труднасьці падвойваюцца абвастрэньнем клясавай барацьбы і супраціўленьнем капіталістычных элемэнтаў, якія няўхільна выціскаюцца ўзрастаючым наступленьнем сацыялістычнага пралетарыяту.

Перамаганьне гэтых труднасьцяй магчыма толькі пры рашучым палянштэньні якасьці работы і дысцыплінаванасьці працы ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі. Паніжэньне сабекошту прамысловай прадукцыі на працягу 5 год на 35 проц.; зьніжэньне сабекошту будаўніцтва на 50 проц.; павышэньне прадукцыйнасьці прамысловае працы на 110 проц.; павышэньне ўраджайнасьці на 35 проц.; пашырэньне пасеўнай плошчы на 22 проц.; бязумоўнае выкананьне праграмы калгаснага і саўгаснага будаўніцтва; рашучая барацьба з прагуламі і расхлябанасьцю на вытворчасьці; умацаваньне працоўнай дысцыпліны; сацыялістычная рацыяналізацыя вытворчасьці; забясьпячэньне прамысловасьці і сельскае гаспадаркі патрэбнымі кадрамі кіраўнікоў і стварэньне новых кадраў чырвоных спэцыялістых з людзей рабочае клясы, нарэшце, узмацненьне плянава-рэгулюючага пачатку ў сыстэме народнае гаспадаркі,—такія элемэнтарныя ўмовы агульнагаспадарчага парадку, патрэбныя для перамогі труднасьцяй выкананьня пяцігадовага пляну.

Канфэрэнцыя лічыць неабходным адзначыць, што перамаганьне гэтых труднасьцяй і ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну магчымы толькі на аснове найвялікшага росту актыўнасьці і арганізаванасьці працоўных мас наогул і рабочае клясы—асабліва, на аснове ўсямернага ўцягненьня мільённых мас рабочае клясы ў сацыялістычнае будаўніцтва і ў кіраваньне гаспадаркай, на аснове ўсямернага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і магутнага разьвіцьця самакрытыкі мільённых мас зьнізу супроць бюракратычных скажэньняў.

Труднасьці нэрвыду сацыялістычнай рэканструкцыі, асабліва ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы, няўхільна выклікаюць хістаньні ў дробна-буржуазных пластоў насельніцтва, што знаходзіць сваё адлюстраваньне ў некаторых праслойках рабочае клясы і нават у радах партыі. Гэтыя хістаньні, што адлюстроўваюць уплыў дробна-буржуазнай стыхіі, знаходзяць сваё выражэньне ў адыходзе ад генэральнай лініі партыі ў асноўных пытаньнях і, перш за ўсё, у пытаньні аб тэмпе сацыялістычнай індустрыялізацыі, у пытаньні аб разгортваньні сацыялістычнага наступленьня на кулацтва і наогул на капіталістычныя элемэнты і ў пытаньні аб усямерным умацаваньні сацыялістычных форм гаспадаркі ў вёсцы.

У зьвязку з гэтым у даных умовах найбольшай небясьпекай унутры партыі зьяўляецца правы ўхіл, як выяўленьне простага адмаўленьня ад ленінскай палітыкі партыі, як выражэньне адкрытага апартуністычнай здачы ленінскіх пазыцый пад націскам клясавага ворага. Толькі бязьлітасны адпор усім хістаньням у правядзеньні генэральнай бальшавіцкай лініі, ажыцьцяўленьне якое азначае ўзмацненьне саюзу рабочае клясы з сялянствам, пры далейшым узмацненьні кіруючай ролі рабочае клясы, можа забясьпечыць выкананьне пастаўленых пяцігадовым плянам задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Канфэрэнцыя выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць у тым, што партыя дасьць разбураючы адпор ня толькі праваму ўхілу, але і ўсякім прымірэнчым настроям у адносінах ухілаў ад ленінскай лініі.

Д. Мірончык

АБ ПРАЯЎЛЕНЬНЯХ ВЯЛІКАРУСКАГА ШАВІНІЗМУ

Супроць нацыяналізму і шавінізму ўсіх відаў і розьнавіднасьцяй партыя вядзе і будзе весьці жорсткую барацьбу. Нацыяналізм і шавінізм—зброя клясавага ворага. Барацьба з імі—ёсьць барацьба клясавая, барацьба за ўзмацненьне дыктатуры пралетарыяту.

Асноўная маса рабочых і працоўнага сялянства, значная частка інтэлігенцыі вразумелі нацыянальную палітыку партыі, значныя масы прымаюць удзел у правядзеньні гэтай палітыкі. Але ёсьць пэўныя групы, якія ня могуць пагадзіцца з ленінскай лініяй у нацыянальным пытаньні. Гэтыя групы адносяцца варожа да нашай палітыкі і хочуць нацыяналістычнага і шавіністычнага «выравнаньня» гэтага пытаньня. У сувязі з цэлым радам умоў, нацыяналізм і шавінізм у асяродзішчы навасобных груп усіх нацыянальнасьцяй паказваюць адзнакі росту.

Ваяўнічы беларускі шавінізм і нацыяналізм не разглядаюць нацыянальную палітыку партыі, як сродак для забясьпячэньня культурнага і гаспадарчага ўздыму працоўных мас, забясьпячэньня саюзу рабочых і сялян, як сродак да пабудовы сацыялізму. Праграма гаспадарчага і культурнага будаўніцтва Савецкай Беларусі ня ўжытна для іх, для іх беларусізацыя зьяўляецца самамэтай, яна ім неабходна для забясьпячэньня «незалежнай» «дэмакратычнай» Беларусі — буржуазнага характэру разьвіцьця Беларусі.

Вялікарускі ваяўнічы шавінізм выступае супроць беларусізацыі пад сьцягам неабходнасьці захаваньня вялікай «адзінай расійскай нацыі», адзінай культуры, адзінай расійскай дзяржавы.

Зусім відавочна, што абодвы нацыяналізмы, таксама як і нямецкі, польскі, латыскі і інш. нацыяналізмы, варожы справе дыктатуры пралетарыяту.

Разумеючы выразна і ясна небясьпеку ўсіх нацыяналізмаў і шавінізмаў для справы дыктатуры пралетарыяту, мы **хацелі-б спыніцца ў данай сувязі толькі на праяўленьнях вялікарускага вялікадзяржаўнага шавінізму.**

Перад намі цікавы дакумант: ананімная анкета, якая праводзілася сярод студэнцтва Беларусі. У гэтай анкеце ёсьць гапытаньне аб адносінах да нацыянальнай палітыкі партыі і беларусізацыі. Трэба падкрэсьліць, што гэта анкета яшчэ раз паказала, што асноўная маса **студэнцтва ўхваляе лінію партыі ў нацыянальным пытаньні.** У справе барацьбы з нацыяналізмам і шавінізмам нашы партыйныя арганізацыі і нашыя ячэйкі ў навучальных установах маюць значныя посьпехі. Разам з гэтым анкета яшчэ раз выявіла наяўнасьць значных нацыяналістычных і шавіністычных настроў сярод навасобных груп студэнцтва ўсіх нацыянальнасьцяй. Трэба даць, што выкалькамі гэтых настроў і праяўленьняў зьяўляюцца таксама і навасобныя члены партыі і камсамолу.

Намылкова думаць, што насіцелямі вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму зьяўляюцца толькі навасобныя вялікарусы, што ў асяродзішчы іншых нацыянальнасьцяй ён ня можа праявіцца. Вялікарускі шавінізм праяўляецца ў асяродзішчы як вялікарусаў, так і беларусаў, яўрэяў, палякаў і г. д.

Некаторыя асобы пачынаюць проста з заявы, што беларускай нацыі няма, што гэта «выдумка», што ёсьць «адзіны рускі народ» і таму нацыянальная палітыка савецкае ўлады памылковая. Адзін студэнт-селянін піша: «Ужасно не люблю белоруссизацию, считаю это лишней затеей, на которую затрачиваются средства и энергия. В отношении других наций, кроме украинцев, считаю необходимым национ. политику». А другі беларус-селянін яму ўторыць: «Добрая нацпалітыка ў адносінах да іншых нацыянальнасьцяй (уабкаў, цюркаў), толькі не беларусаў, як часткі расійскай нацыі».

Калісьці царскі ўрад у сваіх загадах рабіў агаворкі: «кроме евреев». Ён прыкаторыя дасужыя расійскія нацыяналістыя сваю заяву аб «прыязнаньні» нацыянальнай палітыкі партыі забясь

ЗА СВЯДОМУЮ ПРАЦОЎНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ

Барацьба за працдысцыпліну ёсьць барацьба за сацыялістычнае будаўніцтва

Рабочыя, работніцы! Больш крытыкі да сваіх уласных памылак і недахопаў!

Назавем рэчы сваімі назвамі

(У парадку абгаварэньня)

Пытаньні працоўнай дысцыпліны і мастаўлены цяпер у самай рэзкай і выпуклай форме.

Сярод рабочых і служачых прахо-дзіць самаправерка і намацоўваньне слабых месц у працоўнай дысцыпліне. Усё, што перашкаджае падняцьцю працоўнай дысцыпліны, выцягваецца зараз «за ушко да на солнышко».

Час выцягнуць і такое пытаньне, як скарыстаньне рабочага часу для выка-наньня розных аграмаджаных абавяз-каў. Гэта становішча існуе ня толькі на вытворчасьці, але і ў канторах апа-ратаў трэстаў, наркамагаў і ўсіх іншых савецкіх устаноў.

Ні для кога не сакрэт, што ўся гра-мадзкая работа (да яе адносіцца і пар-тыйная, прафсаюзная, кааперацыйная і добраахвотніцкая) арганізоўваецца ў часе рабочага дня: дагаворваюцца па тэлефону, ідуць для асабістых пера-гавораў ва ўсякія грамадзкія арганіза-цыі, складаюцца пляны работ, пішуцца заметкі і артыкулы для насьцянгазэты і для агульнай прэсы, машыністкі дру-куюць работу ў працягу свайго рабоча-га дня, словам, ідзе даволі бойкая актыўная грамадзкая работа, якая фактычна аплачваецца з дзяржаўнай касы і таму траціць значэньне гра-мадзкай нагрузкі.

Калі найбольш сьмелы адміністра-тар ці сакратар установы часамі «адважыцца» і не адпусьціць супрацоўні-ка ці не дазволіць машыністцы выкон-ваць у рабочы час грамадзкаую рабо-ту, ён адпаведнымі таварышамі пера-хрышчаецца ў бюракрата і агрымлівае нагаяй.

Гэта становішча трэба ў корані зьмя-ніць і ўрэгуляваць. **Трэба канчаткова забараніць усякую грамадзкую работу ў рабочы час.**

Трэба ўстанавіць спэцыяльную га-дзіну пасьля работы для выкананьня грамадзка-арганізацыйных абавязкаў з ўсе, хто мае нагрузку па грамадзкай рабоце, былі-б на пэўным месцы і бліза́ка каля якога-небудзь тэлефону.

Гэтым месцам павінен спукыць клюб.

Усе грамадзкія працаўнікі прыхо-дзяць на гэту гадзіну ў клюб і тут та-варышы шукаюць адзін другога, зга-ворваюцца і арганізоўваюць усе свае грамадзкія справы.

У клюбе-ж павінна быць некалькі пішучых машынак і ўстаноўлена чар-говае дяжурства машыністак.

Усякія членскія ўзносы павінны зьбірацца перад пачаткам ці ў канцы агульных партыйных, прафсаюзных і інш. сходаў. (У выключных выпадках можна дапусьціць на вытворчасьці збор членскіх узносаў у гадзіны абе-дзенага перапынку).

Гэта ажывіць работу клюбаў, павя-лічыць загрузку рабочага дня ва ўста-новах і на вытворчасьці чыста вытвор-чымі абавязкамі і зробіць грамадзкую работу... бясплатнай.

Ніводная з грамадзкіх арганізацый не павінна выклікаць да сябе працаў-нікоў у працягу рабочага дня, а ня-хай перабудуе ў адпаведнасьці з гэтым па-радак сваіх работ.

БРАНДАБОЎСКІ.

Праца ня воўк, у лес не ўцячэ

(„Чырвоная Бярэзіна", Нова-Барысаў)

Апошні месяц усе чырвонабярэзінскія арганізацыі вялі напружаную работу па ўзьніманьні працоўнай дысцыпліны і зьніжэньні сабекошту нашых запалак. Пасьля таго, як пабыў на фабрыцы тав. Бэнэк, шмат што ўжо зроблена.

Але-ж добры вынік можна адзначыць толькі ў запалачнічаў «Чырвонай Бярэ-зіны». Зусім інакш стаіць справа з іншымі цэхамі, у прыватнасьці з цэхамі па вырабе ўраўняў і лібэлаў. Гэта тыя цёмныя мясьціны нашае фабрыкі, куды прамень задачы нашага дня не заглянуў.

Цэх ураўняў непасрэднай і простай сувязі з іншымі цэхамі фабрыкі ня мае. Вось чаму сямейка рабочых гэтага цэху жыве ў баку. І калі на сходзе цэ-хавай ячэйкі КП(б)В скончыўся даклад аб узьняцьці вытворчай дысцыпліны, распачаліся спрэчкі.

— Прагулаў у нас амаль няма,—ска-заў адзін,—але-ж ненагружанасьць ра-бочага дня ў нас адчуваецца. Хлопцы працуюць ня больш 6 гадзін, забяруц-ца ў шафу ці сунцю ды сьпяць, або лындаюць па двары.

— Гэта ягчэ нічога, а вось у нас,— кажа работніца Ц.,—работніцы сьпяваюць, гутараць у часе працы аб роз-ных модах і часта сваряцца, а якая ў такіх можа быць праца?

— Ня лепш стаіць справа ў цэху па вырабе лібэлаў. Цэх нядаўна адкрыт, працуюць у ім розныя людзі. Таму ўзьняць працоўную дысцыпліну ў гэтым цэху надзвычайна цяжка.

Вось работніца **Элькінд** кажа:

— На наш цэх патрэбна асаблівая ўва-га. Сварка і плёткі,—вось чым займаюц-ца нашы работніцы.

— Калі-б толькі сваркі, дык гэта ні-чога, але-ж працуюць у нас некаторыя ўсяго 5-6 гадзін. Вось, напрыклад, **Бэй-нэнсон:** цэлыя гадзіны праседжвае, ні-чога ня робячы. І вымову атрымала, але не дапамагло.

— Тав. **Элькінд** казала, што ў на-шым цэху сваркі і плёткі, але-ж якая у нас якасьць лібэлаў? Вось гэтымі днямі 5.000 лібэлаў пайшло ў глум,—да дала работніца К.

Далей узяліся за двор. Каля 15 чал. працуюць на дварэ, працы ёсьць шмат, але няма каму рабіць. Усе рабочыя падзяляюцца на дзьве групы, на чале аднэй стаіць вядомы гультай **Рэпка**, які прытрымліваецца лёзунгу: «работа ня воўк, у лес не ўцячэ», а таму ён і па-добныя яму так і робяць, пачынаюць працаваць праз гадзіну пасьля гудка і канчаюць працу за гадзіну да гудка. Але-ж ёсьць і другая група, на чале якой стаіць **Бэйнэнсон**, дзвіз гэтай групы такі «справы не рабі і ад справы не ўцякай».

С. ЗНАЁМЫ.

У брудзе і п'янстве

(Цукерня МЦРК)

Доўгі час працуюць цукернікі ў сутара-ньні (рог Савецкай і Энгельса), задых-аючыся ад вільгаці і высокай тэмпера-туры. Круглыя суткі ў сутарэньні гарыць электрычнае сьвятло. Сьцены пра-сякнуты амоніем і іншымі атручваючы-мі матэрыямі, якія ўжываюцца пры вы-печцы цукерных вырабаў. Цеснота—не-дапушчальная. Антысанітарнае стано-вішча асуджалася санітарнымі дактара-мі ня раз. 20 з лішнім чалавек там пра-цуе ўдзень у дзьве зьмены. 3-я зьмена ў 5 чалавек працуе над злобнымі рэчамі заўсёды начамі. Вочы, лёгкія і наогул усё здароўе рабочых падарвана. Выпад-кам хвароб няма канца.

У пагоні за прырабаткам рабочых па 10 гадзін у суткі бязупынна знаходзяц-ца ў сутарэньні. Праўда, заработак так вельмі высокі, майстры зарабляюць 200 рублёў і ў падмайстроў заработак дася-гае часамі гэтай-жа лічбы. Тады як асноўны заработак у першых—100 руб., а ў другіх—70-80 руб. Ня гледзячы на тое, што 80 проц. працуючых там зьяў-ляюцца камуністымі і камсамольцамі, узаемаадносіны паміж рабочымі і стар-эйшымі майстрамі і адміністрацыяй са-мыя брыдкія. Пастаянныя сваркі, лаянка і пагрозы. Кантроль над вытворчасьцю самы агідны. Былі выпадкі пракражы цукру і іншых прадуктаў. Мелі месца выпадкі прыводу ўначы ў цукерню пра-стытутак. П'янства і прагулы—звычай-ная зьява ў цукерні. Гэтым асабліва вы-значаецца рабочы **Люрц**, які ня так даў-но, будучы п'яным, паламаў тэлефон.

Барацьба з усімі гэтымі ненармаль-нымі зьявішчамі вядзецца кепска, ці часта зусім не вядзецца. Ні адміністра-цыя, ні фабком не праяўляюць належ-най рашучасьці ў барацьбе з п'яніцамі і прагульшчыкамі, ня прымаюць належ-ных мер для паляпшэньня ўмоў працы і г. д.

Хто зьверне ўвагу на гэта прадпрыем-ства?

С—я. С. Х.

Даволі разгільдзяйства і безадказнасьці

За суровую працоўную дысцыпліну

Наркамправы распрацаваў і ўнёс на вырашэньне Саўнаркому праект пастановы аб мерапрыемствах па ўзмацненьні працоўнай дысцыпліны.

ВСНГ, згодна праекту, прапануецца вараз-жа праверыць, як ажыцьцяўляецца пастанова аб правох трэсту і дырэктароў прадпрыемстваў, пахавых майстроў і інструктароў з пункту погляду ўзьняцьця іх аўтарытэтнасьці і адказнасьці за работу. На ўсіх прадпрыемствах, што налічваюць звыш 150 рабочых, павінны быць арганізаваны тэхнічныя нарміровачныя бюро. ВСНГ павінен праверыць, як ажыцьцяўляюцца ўсе гэтыя мерапрыемствы.

Наркамправы, згодна праекту, даручаецца правесьці масавую праверку як практычна праводзяцца на прадпрыемствах апошнія пастановы ўраду аб узмацненьні працоўнай дысцыпліны.

Страхкасы павінны праверыць работу дактароў, якія абслугоўваюць застрахаваных, і вывучыць прычыны павялічэньня захворваньняў на некаторых прадпрыемствах, узмацніўшы кантроль і барацьбу з сымуляцыяй. Біржам працы запрапанавана строга прытры-млівацца правіл аб парадку пасылкі на работу зволеных за парушэньні працоўнай дысцыпліны рабочых.

Прагульшчыкі на экране

Пытаньні працоўнай дысцыпліны і зьніжэньня сабекошту знаходзяцца ў цэнтры ўвагі барысаўскіх заводаў. Трэба заўважыць, што да гэтага часу працдысцыпліна на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна», гуце імя Домбаля і на радзе іншых прадпрыемстваў кульгала. Прагулы, спазьненьні і нават яўка ў нецьвярозым выглядзе на работу—былі звычайнай зьявай.

У сучасны момант абвешчана рашучая барацьба за павышэньне працдысцыпліны і зьніжэньне сабекошту. На заводах адбыліся спэцыяльныя сходы, якія выпрацавалі рад практычных мерапрыемстваў па барацьбе з прагуламі, п'янствам і г. д. Уведзены «чорныя» і «чырвоныя» дошкі. Прозьвішчы прагульшчыкаў, п'яніц і шкоднікаў вытворчасьці абвяшчаюцца на сходах і публікуюцца ў заводзкіх газэтах. У рабочым клюбе сьпісы прагульшчыкаў дэманструюцца на экране пасьля кінокарцін. У цэхах заводаў праводзяцца гутаркі аб працдысцыпліне. Ужываецца і рашучая мера ўзьдзейнічаньня—звальненьне.

Як адмоўны бок барацьбы за павы-шэньне працдысцыпліны, трэба адзна-чыць непрыстасаванасьць культурна-масавай работы. Гэты недахоп трэба, як мага хутчэй, выправіць.

Ул.

„Зьвязда" зноў зазьзяла"

(Завод „Зьвязда", станцыя Капцэвічы)

Справы на нашым заводзе ў першым квартале 1928-29 г. былі дрэнныя. Зьні-зілася прадукцыйнасьць працы, працдысцыпліна, якасьць прадукцыі, праф-дысцыпліна, словам, становішча было зусім кепскае. Зусім іншае становішча і мы маем цяпер. Бюро ячэйкі разгарнула работу. Першым штуршком для паляпшэньня становішча паслужылі пера-вырабары заўкому. Умацаваньне праф-дысцыпліны адбілася і на вытворчасьці. Працдысцыпліна адноўлена, прадукцыйнасьць працы расьце. Калі мы ў першым квартале выпрацавалі ў сярэднім 42-43 куб. мэтраў фанэры ў дзень, дык у сучасны момант мы вы-працоўваем больш 54-55 куба-мэтраў. Якасьць палепшылася. Калі раней мы выпрацоўвалі мізэрны процант першага гатунку і экспартнай фанэры, дык у сучасны момант мы маем звыш 40 про-цантаў экспартнай прадукцыі. Прагулы амаль зьнішчаны. П'янства памян-шаецца, дзякуючы належнай работе таварыства па барацьбе з п'янствам; ня толькі гарэлкі, але і піва няма ў продажы.

Але на гэтым мы ягчэ не супакоілі-ся. 10-га красавіка на заводзе абвешча-на спаборніцтва паміж зьменамі. Першы дзень ужо даў вялікія вынікі. Калі да 10-га красавіка выпуск прэсаў на ўсе тры зьмены складаў у сярэднім 72-74 куба-мэтры, дык 11-га мы маем 84.

Арганізуюцца ўдарныя групы.

З прафдысцыплінай таксама вялікі зрух. Калі пры старым заўкоме як схо-ды, так і вытворчыя нарады наведваліся выключна прафактывам, дык зараз сходы наведвае 75-80 проц. членаў саю-зу, вытворчыя камісіі і нарады абараю-чаюцца ў масавыя сходы па абгаварэньні вытворчых пытаньняў. Палепшылася і культурнае абслугоўваньне рабочых.

Але гэтыя дасягненьні нельга ягчэ назваць выстарчальнымі. Рабочыя заяві-лі, што наш завод павінен стаць прыкладным для другіх.

Ш. Коцін.

Камсамольцы хуліганяць

Групком саюзу харчавікоў не вядзе ніякай культурнай работы сярод рабочых Мазырскай пякарні ЦРК, дзе праце 37 чалавек.

У апошні час у пякарні сярод моладзі пачасьціліся выпадкі хуліганства. Камсамолец **Бэйлін**, ён-жа прадстаўнік моладзі, зьдзекуецца з работніцы пякар-ні Рушылавай, назваў яе аднойчы пра-стытуткай. Другі вучань пякарні **Кат-лоўскі** бярэ з яго прыклад. Калі Руш-лава папрасіла ў яго сухара да гарбаты, Катлоўскі паслаў яе ва ўборную.

Ёсьць выпадкі, калі ў часе работы рабочыя распачынаюць бойку. Камсамо-лец **Зэльгін** нядаўна пабіўся з рабочым **Гаўштэйнам**. Адміністрацыя зьняла Гаўштэйна з работы, а Зэльгіну абвясь-ціла строгую вымову. Але групком саю-зу запрапанаваў адпавіць Гаўштэйна па рабоце. Старшыня групкому **Лібэрман** нават хацеў, каб скасавалі вымову Зэльгіну, але іншыя члены групкому запратэставалі.

Бюро гандлёва-кааперацыйнай камса-мольскай ячэйкі павінна заглянуць у пякарню ЦРК і падцягнуць хуліганаў-камсамольцаў.

ВОКА.

Правяраем дырэктывы пленуму ЦК КП(б)Б

Ці ўсё зроблена

для пасьпяховага правядзеньня сяўбы

ВЫКАРЫСТАЕМ КАРОТКІ ТЭРМІН ДЛЯ ВЫПРАЎЛЕНЬНЯ ПАМЫЛАК, ЗАБЯСЬПЕЧЫМ СЯЛЯНСТВА КРЭДЫТАМ, НАСЕНЬНЕМ І ЎГНАЕНЬНЯМІ. ДАПАМОЖАМ БЕДНАЦЕ

Дапаможам беднаце апрацаваць палі

Адным з слабых месц у падрыхтоўцы да пасеўкампаніі вяўляецца арганізацыя дапамогі беднаце.

Неабходна час, які застаецца да сяўбы, выкарыстаць для выпраўленьня недахопаў у справе разьмеркаваньня насеньня, с.-г. інвэнтару і інш., прыцягнуўшы да гэтага бяднякоа-серадняцкіх масы і ў першую чаргу групы беднаты. Апошнія павінны сачыць за правіль-ным правядзеньнем клясавай лініі нашымі пізавымі ўстановамі і свячасова дабівацца выпраўленьня памылак.

На жаль, трэба канстатаваць, што бед-ната слаба арганізавана вакол пытань-ня пасеўкампаніі. Камітэтам сялянскай узаемадапамогі трэба мець пэўныя да-ныя аб беднаце ў кожнай вёсцы—у ка-го няма каня, с.-г. інвэнтару, насеньня і інш.—і прыняць усе меры да забесь-пячэньня ня праз крэдытныя таварыст-вы, пракатныя пункты, саўгасы і калгасы.

Да рэчы аб пракатных пунктах. Трэ-ба зараз-жа праверыць стан інвэнтару і машын, бо, як звычайна бывае, больш-часьць інвэнтару і машын патрабуе ра-монту.

Далей, пара ўжо пачаць падрыхтоўку да арганізацыі грамадзкага ворыва і васеву палёў беднаты, якая ня зможа сваімі сіламі і сродкамі справіцца з гэ-тай задачай. Трэба зараней улічыць маг-чымасьці ў кожнай вёсцы і арганізаваць групы сялян, якія добраахвотна пойдуць на грамадзкую справу па пачыне і пры непасрэдным удзеле партыйцаў і камса-мольцаў, якія маюць сваю гаспадарку. Да гэтай работы трэба прыцягнуць саў-гасы і калгасы.

Без дапамогі арганізаваным грамадз-кім парадкам бядняк часта па сваёй не-сьвядомасьці вымушаны будзе пайсьці ў кабалу да кулака, бо тут кулак не прапусьціць моманту выкарыстаць бед-нату ў сваіх інтарэсах і тым самым па-спрабуе ўзяць яе пад свой уплыў.

Парт'ячэйкі, групы беднаты, КСУ, сельсаветы і с.-г. крэдыткааперацыя па-вінны праверыць у сябе, ці ўсё ўжо зроблена для таго, каб бядняк ня трапіў да кулака ў кабалу, пад яго эканамічны, а тым самым і палітычны ўплыў, ці правільна разьмеркаваны крэдыты, ці няма і тут выкрыўленьняў.

Трэба на грунах і сходах беднаты пра-працаваць ўсе пытаньні падрыхтоўкі да пасеўкампаніі і праверыць, што зроблена ў інтарэсах беднаты. Да пачатку сяў-бы дабіцца поўнага скарыстаньня каапэ-рацыйных бядняцкіх фондаў і растлу-мачыць беднаце аб існуючых ільготах для яе ў атрыманьні крэдыту і інш.

Застаўся зусім кароткі час да сяўбы, яго трэба выкарыстаць для выпраўленьня ўсіх недахопаў у падрыхтоўцы да пасеўкампаніі і ў асаблівасьці па аказаньні дапамогі беднаце.

Я. КАЗАК.

ЮРАВІЦКІ РАЁН НАПЕРАДЗЕ

МАЗЫР (наш кар.). Пытаньне аб узьняцьці ўраджайнасьці і новым за-коне аб сельска-гаспадарчым падатку абгаворана ва ўсіх раёнах. Сяляне на сьвяіх агульных сходах прымаюць пастановы аб абавязковай ачыстцы насеньня, аб забароне пасьвіць жывелу як на пасевах, так і сенажаці, даручаюць сельсаветам дасканала вы-явіць існуючыя і бросавыя земліўжы-ваючы меры да іх засеву.

На 7 красавіка па раёне ачышчана насеньня 383,4 тоны, што складае 71,5 проц. заданьня. Ачыстка насеньня ня спыняецца і зараз. Некаторыя машыны загружаны так, што прыходзіцца працаваць і начамі.

Да гэтага часу арганізавана ў раёне 5 новых калгасаў і ёсьць заяўкі на арганізацыю ягчэ 5 калгасаў. Арганізаваны 2 новыя машынныя тавары-ствы, 2 мэліярацыйныя арцелі, адно пасёлкавае таварыства і адно насен-наводнае таварыства, з лікам членаў ва ўсіх гэтых таварыствах 290 чалавек.

Заяўкі сялянства на сельска-гаспа-дарчыя машыны да пасеўкампаніі зда-вальняюцца ў належнай меры, за вы-ключэньнем заявак калгасаў на рад-ковыя сяялкі.

На раёне на 7 красавіка ўжо спаг-нана 13.255 рублёў або 69 проц. сродкаў на самаабкладаньні.

Б. Ш.

Камсамольцы заводу „Энэргія" дапамагаюць сялянам

У суботу, 13 красавіка, камсамольская ячэйка заводу «Энэргія» арганізавала суботнік на карысьць сялян падшэфнай заводу вёскі, каб дапамагчы ім у правядзеньні вясновае сяўбы.

У суботніку прымалі ўдзел, акрамя ка-самольскага калектыву і дарослыя рабочыя. Усяго ў суботніку ўдзельнічала 13 ч. Сабраныя сродкі ў суме кала 80 р. пойдуць на набыцьцё с.-г. інвэнтару для падшэфнай вёскі.

Да Менскага акруговага зьезду саветаў

4 мільёны руб.---на народную асьвету

Эканамічнае ўзмацненьне акругі дало магчымасьць павялічыць асыгнаваньні на справу народнае асьветы. Калі ў 1926-27 годзе выдаткі на нарасьвету складалі 2.914.734 руб., то ў 1927-28 г. гэтая сума павялічана да 3.428.963 руб., а ў 1928-29 г. яна ўзрасла да 4.040.837 руб.

Асабліва за апошні год узрасьлі выда-ткі на народную асьвету па раённых бюджэтах: з 1.601.420 руб. у 1926-27 г. да 2.145.112 руб. у 1928-29 годзе. Гэта лічба складае 97,5 проц. усёй сумы сель-ска-гаспадарчага падатку, налічанага сёлета на індывідуальныя гаспадаркі аку-гі.

У мэтах большага ахопу школамі дзя-цей працоўнага насельніцтва, сетка школ з кожным годам пашыраецца. Гэ-тае павялічэньне сеткі характарызуецца наступнымі лічбамі. У 1926-27 г. усяго на акрузе налічвалася 3 дзевяціго́дкі, 71 сямігодка і 887 чатырохгодак. У 1927-28 г.—4 дзевяцігодкі, 73 сямігодкі і 932 чатырохгодкі. А ў 1928-29 г.—2 дзевяці-годкі, 76 сямігодак і 976 чатырохгада-вых школ. Апрача гэтага ёсьць 2 школы сялянскай моладзі, 5 прафшкол і 4 спэцклясаў.

Школьнае будаўніцтва

Пашырэньне школьнай сеткі патрабуе пабудовы новых школьных будынкаў. Значная частка нашых школ (прыблізна 40%) зьмяшчаецца ў наёмных будынках. Многія з іх зусім не прыстасаваны да школьных патрэб. Але трэба адзначыць, што, ня гледзячы на значнае павялічэньне сродкаў на будаўніцтва школьных памяшканьняў, рост будаўніцтва і да гэтага часу адстае ад росту школьнае сеткі.

Будаўніцтва па-заплянавых школ сі-ламі сялянства мае вялікае значэньне ў зьвязку з тым, што плянавае будаў-ніцтва значна адстае. За пярэдні з 1923 году па 1927-28 год сіламі сялянства па-будавана 117 школ, будуецца 12 і наме-чана да пабудовы 37.

За апошнія гады значную дапамогу школьнаму будаўніцтву на вёсны аказ-ваае сялянства праз самаабкладаньне. Так, да 1-га кастрычніка 1928 г. на школьнае будаўніцтва (выключна) па-ступіла ад самаабкладаньня 198.563 р. З гэтай сумы да 1-га кастрычніка 1928 году выдаткавана на будаўніцтва і ра-монт школ 102.210 руб.

З кожным годам павялічваюцца і бюд-жэтныя асыгнаваньні на рамонт школ. У 1927-28 г. на рамонт гарадзкіх і вяс-ковых школ было асыгнавана 52.640 р., а ў 1928-29 г.—64.821 руб.

Але, ня гледзячы на ўсё гэта, стано-вішча большасьці школьных будынкаў, асабліва ў вёсцы, вельмі дрэннае. Значная частка школ слаба забясьпечана на-лежным абсталяваньнем і прыладамі, што ў сваю чаргу выклікае неабходнасьць ягчэ большага павялічэньня асыгна-ваньняў на патрэбы школ.

Усеагульнае навучаньне

Згодна пастановы 2-га акруговага зьез-ду саветаў прэзыдыум Менскага АВК правёў абавязковае навучаньне для дзя-цей 8-гадовага ўзросту ў пачатку мінулага навучальнага году ў гарадох: Мен-ску, Барысаве, Чэрвені і 692 населеных пунктах акругі (15 мястэчках і 677 вёсках).

Абавязковым навучаньнем было ахоп-лена 267 школ, з іх 27 гарадзкіх і 26 раённых сямігодак, а рэшта—вясковыя пачатковыя школы. У гэтым годзе ўсе-агульнае навучаньне дадаткова ўведзе-на ў адным мястэчку і ў 1.292 населе-ных пунктах.

Практыку ўвядзеньня ўсеагульнага на-вучаньня ў Менскай акрузе трэба лічыць здавальняючай.

Дапамога дзецям беднаты

Задача **павялічэньня пралетарска-бід-няцкага ядра ў школах** у сваю чаргу па-трабуе паляпшэньня дапамогі бяднейшым вучням як з боку дзяржавы, так і з боку савецкай грамадзкасьці. Каб дапамагчы дзецям беднаты пры раённых сямігодках арганізоўваюцца інтэрнаты, якіх па акрузе налічваецца 24; у іх зьмяшчаецца 852 вучні.

Апрача арганізацыі інтэрнатаў для бяднейшых вучняў, здавальненьне іх у першую чаргу падручнікамі і пісьмовы-мі прыладамі, для іх адпускаюцца і грашовыя сродкі. У 1927-28 г. для дапа-могі дзецям беднаты было асыгнавана 9.100 руб., а ў 1928-29 годзе ўжо 46.300 руб. Акрамя гэтага ў бягучым навуч-альным годзе да 1 сакавіка на дапамо-гу дзецям беднаты і батракоў сабрана ад грамадзкіх арганізацый і насельніцтва 15.245 руб., што складае 33 проц. бюджэтных сум на гэту мэту.

Расьце сетка палітасьветных устаноў

Ня гледзячы нашпаркі рост сеткі па-літасьветных устаноў па акрузе, яны ня могуць абслужыць поўнасьцю ўсяго на-сельніцтва. Калі ўзяць нардамы і хаты-чытальні (разам), то на адну сеткаваую ўстанову прыпадае прыблізна 89 насе-леных пунктаў з 8.210 чал.

Існуючыя палітасьветныя ўстановы, ня гледзячы на штогодняя павялічэньні бюджэтных асыгнаваньняў, абсталяваны недастаткова. Не хапае сродкаў на навуль-ную частку, рамонт, гаспадарчыя выдаткі, не гаворачы ўжо аб будаўніцтве новых памяшканьняў, якое выклікае-цца самім жыцьцём.

Склад работнікаў палітасьветных уста-ноў прымушае жадаць лепшага.

Досыць значная праца праароблена ў галіне **ліквідацыі няпісьменнасьці.** Ахоп няпісьменных ліквупктамі з кожным го-дам павялічваецца, што відаць з наступ-ных лічбаў У 1926-27 г. на ліквпунктах і ў школах малапісьменных навучалася 6.624 чал., у 1927-28 г. навучалася 10.453 чал. У 1928-29 годзе толькі па 13 раёнах акругі і гораду Менску лік вучняў ліквпункту дасягнуў 17.000 чал.

Наогул трэба адзначыць, што Менская акруга ў справе народнае асьветы мае досыць значныя дасягненьні

З-ці акруговы зьезд саветаў намеціць канкрэтныя мерапрыемствы, якія павін-ны паглыбіць культурнае будаўніцтва па акрузе.

Н. А.

Нарада па дарожным будаўніцтве

У сувязі са зьездам саветаў акругі аўтакіраўніцтва мяркуе разам з Аўта-ларам склікаць нараду дэлегатаў зьезду па пытаньні аб аўтабусным і аўтама-більным руху ў раёнах. На нарадзе будуць абмеркаваны маршруты аўта-бусных ліній, якія намячае Аўтакі-раўніцтва. Сёлета Аўтакіраўніцтва мяр-куе поўнасьцю злучыць Менск з ра-ёнамі акругі і галоўнымі чыгуначны-мі магістралямі. Так, намечана арга-нізаваць 5 пасажырскіх рэйсаў па наступных напрамках: Менск—Астрашыцкі Гарадок—Лагойск—Пле-шчаніцы—Зэмбін—Барысаў; Барысаў—Халопенічы—Лепель; Зэмбін—Бя-гомль—Лепель; Менск—Самахвалавічы—Капыль—Слуцк; Менск—Сьмілавічы—Чэрвень—Бярэзіна.

Для ажыцьцяўленьня намечанага пляну патрэбна дапамога і садзейні-чаньне ўсёй грамадзкасьці, раённых выканкомаў і сельсаветаў. У гэтай рабоце ініцыятарамі і кіраўнікамі па-вінны стаць арганізаваныя на месцах ячэйкі Аўтаклюру. Асабліва значэньне набывае тут закон аб працоўнай да-рожнай павіннасьці. Пры ўмелым кі-раўніцтве і скарыстаньні рабочай сі-лы нашы дарогі можна будзе зрабіць прыгоднымі для язды на аўтабусах.

Перад чысткай савецкага апарату

Чыстка апарату сваячасовая і патрэбная

Рабочыя дапамогуць РСІ ў гэтай вялікай рабоце

Пастанова агульнага сходу рабочых заводу „Чырвоная Зара"

Ледзь адгучэў гудок, як заводзкая сталоўка пачала запаўняцца рабочымі і работніцамі заводу «Чырвоная Зара».

На агульна-заводзкі сход, прысьвя-чаны пытаньню чысткі савецкага апа-рату, прышлі амаль што ўсе рабочыя.

Даклад тав. **Лубужа** аб задачах і практычным правядзеньні чысткі са-вецкага апарату быў праслуханы з вя-лікай увагай.

Спрэчкі што разгарнуліся па дакла-ду т. Лубуша, паказалі, што **рабочыя заводу «Чырвоная Зара» поўнасьцю ўхваляюць пастанову аб правядзеньні чысткі савецкага апарату.**

Выступаўшыя рабочыя і работніцы гаварылі:

— Чыстка сваячасовая і патрэбная.

— У нашым апараце шмат бюракра-таў, растратчыкаў, спэкулянтаў і ка-піталістых.

Яны перашкаджаюць посьпехам на-шага сацыялістычнага будаўніцтва, таму іх трэба як мага хутчэй вы-чысьціць з савецкіх устаноў.

— Вычышчаных ня трэба прымаць на другую работу і на вучот біржы працы.

Рабочыя «Чырвонай Зары» вылучылі 8 лепшых таварышоў у брыгаду дапа-могі чысткі апарату.

У брыгаду ўвайшлі:

— **Ксяндзоў**—стары рабочы, член КП(б)Б; **Кацько**—качагар, працуе на вытворчасьці каля 40 год; **Куц**—пэ-саўшчык патачнага заводу; **Плако**—упакоўшчыца, кандыдат партыі; **Мі-ляўскі**—малады рабочы, камсамолец; **Вайнэр**—упакоўшчык, член партыі; **Ламака** — упакоўшчыца, актывістка, член ЦВК БССР; **Шатрун**—качагар з вялікім вытворчым стажам.

Сход аднагалосна зацьвердзіў рэзалю-цыю, якая цалкам ухваляе пастанову аб правядзеньні чысткі апарату.

Т.

У Віцебску чыстка пачнецца 4-га мая

Рабочая грамадзкасьць вітае правядзеньне чысткі апарату

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Віцебскія арга-нізацыі рыхтуюцца да чысткі савецкага апарату. У некаторых установах ужо арганізаваны камісіі з прадстаўнікоў мясцкомаў, парт'ячэек і адміністрацыі. Чыстка пачнецца 4-га мая.

Агульнагарадзкі сход рабкораў, чле-наў рэдкалегій насьценных газэт, груп лёгкай кавалерыі і інш., якія заслухалі даклад старшыні АКК-РСІ тав. Мундау аб надыходзячай чыстцы савецкага апа-рату, у сваіх выступленьнях аднадушна віталі мерапрыемствы партыі і ўраду.

Рабочыя брыгады на дапамогу вёсцы

Рабочыя адлічваюць частку свайго заработку на куплю машын для падшэфных вёсак

Паход рабочых брыгад у вёску ўсё пашыраецца. Кожны дзень ў вёску вы-яжджаюць дзесяткі новых рабочых атра-даў для аказаньня дапамогі сялян-скай беднаце па рамонце сельска-гаспа-дарчага інвэнтару. Рабочыя гораду па справе дапамагаюць нашай адсталай вёсцы ў яе паходзе за ўраджай.

У цэлым радзе карэспандэнцый, атры-маных намі на працягу апошніх двух дзён, рабкоры і селькоры паведамляюць аб практычных дасягненьнях у справе дапамогі беднаце.

***

Рабочая брыгада 8-га артпалка выеха-ла ў падшэфную вёску Караліпчавічы і за тры дні паправіла 42 плугі, 35 ба-рон і рад дробных сельска-гаспадарчых прылад, а таксама падкавала 19 коняй. Адначасова чырвонаармейцы растлума-чылі сялянству значэньне апошніх ме-рапрыемстваў ураду па ўзьняцьці ўрад-жайнасьці.

Рабочыя чыгуначнікі станцыі Мазыр ужо адрамантавалі большую частку ін-вэнтару сваёй падшэфнай вёскі. Апрача таго, рабочыя арганізавалі суботнік і ад-лічылі на дапамогу вёсцы аднадзенны заработак. На сабраныя сродкі чыгунач-нікі купляюць складаныя машыны і арганізоўваюць у падшэфнай вёсцы ма-шыннае таварыства.

Менскія рабфакаўцы па падпісным лісьце сабралі сярод студэнцтва і навуко-вых працаўнікоў звыш 100 рублёў. На гэтыя грошы рабфакаўцы набылі трыер, які адправілі ў падшэфныя вёскі Грыча-нскага сельсавету. Апрача таго, раб-факаўцы накіравалі ў вёску некалькі брыгад для культурна-растлумачальнай работы сярод сялянства. Рабфакаўцы выклікаюць усіх студэнтаў іншых ВНУ Беларусі і Менску пасьледаваць іх пры-кладу.

Рабочыя Эльводу арганізавалі суботнік на карысьць падшэфнага сельсавету. За дзьве гадзіны звышнормавай работы атрымана 200 руб. На гэтыя сродкі рабочыя арганізавалі брыгаду, якая ўжо выехала ў Астрашыцка-Гарадзецкі сельсавет.

Па Савецкай Беларусі

Памяці ахвяр стракапытаўшчыны

ГОМЕЛЬ (наш. кар.). У Гомелі, у зьвязку з 10-годзьдзем з моманту стра-ракапытаўскага мяцежу, адкрыта пры дзяржмузэі імя Луначарскага выстаў-ка, якая адлюстроўвае падзеі страка-пытаўшчыны на Гомельшчыне. У вы-стаўцы ўдзельнічаюць з сваімі працамі ўсе члены гомельскае філіі ўсебеларуска-га аб'яднаньня мастакоў. Выстаўку ўжо наведала больш 3000 рабочых і вучнёства.

Замест царквы---школа

ГОМЕЛЬ (наш. кар.). Сяляне вёскі Агародні, Гомельскага раёну пастанавілі пераабсталяваць пустуючы будынак царквы пад школу. РВК адпускае на пераабсталяваньне 4000 руб. У часе вялікадню моладзь будзе спраўляць дзень «1-й баразны», а мопраўская ячэйка засее свой вучастак.

Растраты ў Слуцкім РВК

Загадчык фінчасткі Глінскі аддаецца пад суд

СЛУЦАК. (Наш кар.). Бабруйскі акруговы аддзел Дзяржфінкантролю выкрыў зла-чынствы ў фінансавай частцы Слуцкага РВК. Загадчык фінчасткі Глінскі з сабра-ных грошай ад ападаткаваньня, частку за-біраў сабе. Каб закрыць растраты, Глінскі падрабляў подпісы працаўнікоў агэнтства Дзяржбанку, пасаў фіктыўныя рэестры і іншымі спосабамі паказваў на кнігах, што нібы грошы выданы. Глінскі самачынна адмяніў пастановы падатковай камісіі па кант памяншэньня падатку вясковым гас-падаркам. Усяго ён прысвоіў па Слуцкім РВК 903 рублі, акрамя таго, будучы загад-чыкам фінчасткі Жлобінскага РВК, Глінскі таксама пра падлогі пакінуў сабе 1.080 р. грамадзкіх грошай. Глінскі аддаецца пад суд.

ПАПРАЎКА

У канцы першай калонкі справаздачы аб дакладзе т. Карклі́на, («Зьвязда» № 86), дзвацаты радок зьнізу) прапу-шчана словы—«У значнай часьці». Трэ-ба чытаць: «Але гэтыя фонды, у зна-чнайнай часьці, знаходзяцца ў руках ку-лацкіх гаспадарак».

справе сацыялізму інтэлігэнцыя займа-ецца таўчэньнем вады ў ступе!

Усе гэтыя заявы выразна і ясна па-казваюць налічча варожых адносін гэ-тых асоб да задач партыі па падняцьці мільённых мас беларускага працоўнага сялянства на оправу сацыялістычнага будаўніцтва.

Забесьпячэньне насельніцтва мясам

Узмацняюцца мясазагатоўкі на мясцовым рынку

(Гутарка з акруговым інспэктарам гандлю т. Гравітам)

Перабої ў забесьпячэньні мясам за апошнія дні тлумачацца адсутнасьцю патрэбнае колькасьці мяса, якое прывозіцца да нас з Украіны.

— Менск заўсёды пераважна забесьпечваўся мясам з Украіны. Але з прычыны таго, што дастаўка мяса з Украіны спынілася, стаіць задача забесьпячэньня гораду мясам за кошт мясовых загатовак.

Для ўзмацненьня загатовак Кіргандаль прыняў самыя энэргічныя меры. Кожнаму нізавому загатоўчаму пункту ён ужо ўвёрдае заданьне адпраўляць штодзенна ў Менск пэўную колькасьць розаў жывёлы. За дзейнасьцю прыватных мясьніковуў устаноўлены нагляд. Усе прыватныя абязваны вывесіць у сваіх крамах табліцы з цэнамі, па якіх яны адпушчаюць мяса.

Самі спажыўцы павінны сачыць за тым, каб прыватныя не павышалі цаны на мяса і аб усіх парушэньнях цэн трэба паведамляць у міліцыю і акргандаль.

Адначасова прыняты меры на эканомны выдаткаваньні мяса і водпуску яго ў першую чаргу арганізаванаму насельніцтву.

Праводзіцца рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні загатовак прадуктаў, якія замяняюць мяса, як яйкі, малако, масла, кансэрвы і г. д.

ЦРК у бліжэйшы час атрымае два вагоны з яйкамі. Узмацняюцца загатоўкі сялянскага масла, рыбы, селядцоў і мясных кансэрваў.

Для ўзмацненьня мясных загатовак у раёны камандзіраваны рад працаўнікоў каапэрацыі.

Паход за жылую плошчу

Чаго патрабуюць рабочыя брыгады

Кампанія па барацьбе з кватэрным крызісам у Менску знайшла жывы водгук як сярод рабочых, так і з боку гарадзкога савету.

На сёньняшні дзень рабочыя брыгады выявілі каля 120 кватэр, якія ў бліжэйшы час вызваляюцца ад непрацоўнага элементу.

Разам з выяўленьнем лішняй жылой плошчы і высяленьнем непрацоўнага элементу, рабочыя брыгады патрабуюць паскорыць выданьне жыльлёвага кодэксу, а таксама закону аб ушчыльненьні, арганізацыі рабочых кантрольных троек у прыватных домаўладаньнях з рабочых жыхароў, якія займаюць 30 проц. норму. Тройкі павінны наглядзець за правільным вуютам 30 проц. нормы і выкананьнем прыватнымі домаўласьнікамі пастаноў гар савету аб свячасовым рамонце.

Як будзе праходзіць высяленьне?

Штаб кіраўніцтва гэтым паходам разам з прадстаўнікамі пракуратуры і міліцыі распрацаваў метады выканаьня пастаноў штабу аб высяленьнях, ушчыльненьнях, неправучоце жылой плошчы і г. д.

Непрацоўнаму элементу будзе пасылацца пісьмовае паведамленьне аб яго высяленьні. Калі-ж у прыцягу месяцу гэтая катэгорыя кватэрантаў не аслабяніць жылое плошчы, справа перадаецца ў жыльлёва- судовую камэру. Такія справы аб кватэрах суд павінен разглядзець не пазьней як праз два дні з моманту падачы заявы. Пры жыльлёвай камэры ўводзіцца пасада спэцыяльнага суднага выканаўцы.

Рабочыя брыгады выказаліся за тое, каб камэра прадавала ў вячэрні час. Узьнята пытаньне аб тым, каб пры жыльлёвай камэры пастаянна дзяжурылі юрыс-консульты для дачы юрыдычнай дапамогі працоўным. Пры штабе кіраўніцтва утворены выканаўчыя тройкі, якія будуць правяраць, як праводзіцца ў жыцьцё пастанова штабу кіраўніцтва ў органах камгасу.

Продаж гарэлкі будзе абмежаваны

Арганізуюцца новыя камітэты па барацьбе з алкагалізмам

Па вестках ЦСПСБ барацьба з алкагалізмам ва многіх раёнах і акругах Беларусі яшчэ дагэтуль не разгорнута.

ЦСПСБ прапанаваў усім Акрпрафбюро прыступіць да арганізацыі часовых антыалкагольных камітэтаў. У актыўную работу па барацьбе з алкагалізмам павінны быць уцягнуты ўсе грамадзкія і каапэрацыйныя арганізацыі, органы Наркамасьветы, Наркамату Аховы Здароўя, Наркампрацы. Асноўная задача камітэтаў у пачатку свае работы падрыхтаваць актыў і арганізаваць на больш буйных прадпрыемствах, у клюбах, жактах, пры мэдпунктах, хат-чытальнях ячэйкі таварыства па барацьбе з алкагалізмам.

Усебеларускі камітэт па барацьбе з алкагалізмам распрацаваў спэцыяльны праект, паводле якога будзе забаронена адкрывать новыя крамы па продажы гарэлкі.

Будзе забаронена таксама алкагольная рэклама ва ўсіх яе відах.

Па лініі Наркамату Аховы Здароўя намячаецца ўтварэньне ў гарадох і ў першую чаргу ў буйных рабочых пасёлках сеткі антыалкагольных дыспансераў і іншых прафілактычных устаноў, арганізацыя і пашырэньне вытворчасьці фруктавых і ягадных вод, хлебнага квасу са значным паніжэньнем цэн на іх.

Праектам прадугледжваецца таксама пашырэньне сеткі чайных—закусачных і рабочых кафэ з культурнымі і мастацкімі забавамі.

Мяркуецца таксама выдаць антыалкагольную літаратуру, пашырыць сетку бібліятэк-чытальняў, наблізіць тэатр і музыку да рабочых мас.

Будзе таксама паніжаны кошт радыёўстановак і ўведзены льготны крэдыт па іх аплаце.

Антырэлігійныя музэі ў Беларусі

У працягу лета ў акруговых цэнтрах Беларусі намячаецца арганізацыя раду паміжсаюзных і агульна-гарадзкіх антырэлігійных музэяў. Адначасова праектуецца адчыненьне ў новых клюбах, асабліва ў тых, якія знаходзяцца далёка ад гарадзкіх цэнтраў, невялікіх выставак антырэлігійнага і прыродазнаўчага характару.

НАША СЬВЯТА—1 МАЯ

Вялікодныя байкі ўсыпляюць рэвалюцыйную пільнасьць працоўных

Антысэмітызм і вялікдзень

Рэлігія і антысэмітызм прадстаўляюць сабой улюёны для буржуазіі сродак барацьбы з рэвалюцыяй і сацыялізмам. Чым больш растуць рэвалюцыйныя настроі працоўных мас, тым шырэй нашы ворагі скарыстоўваюць гэтыя атрутныя сродкі клясавай барацьбы.

Трэба-ж адводзіць неадпаўпельнае мае у бясьпечнае для пануючых клясаў рэчышча!

З гэтай мэтай зьвярталіся і зьвяртаюцца да ўзбудженьня патрыятызму. З тэй-жа мэтай разгортваецца рэлігійная і антысэмідцкая агітацыя. Вазьмеце любую капіталістычную дзяржаву, і вы ўбачыце, што ўсюды пануючая эксплёататарская кляса гарой стаіць за «бацькаўшчыну» ці «родны край», бога і царкву, за антысэмітызм. Фактычнае становішча такое, што антысэміты на баку царквы, а папы на баку антысэмітызму.

Царква і антысэмітызм, гэта—два бакі адной палітыкі, палітыкі капіталістычнай буржуазіі. У часе і напярэдадні вялікдню нашы ворагі з асаблівай энэргіяй разгортваюць антысэмідцкую агітацыю, гаворачы аб тым, што жыдзі, моў, прадалі хрыста і што яны крадуць хрысьціянскіх дзяцей, каб харчавацца іх крывёю і інш. Прыходзіцца толькі дзівіцца, што ўсёй гэтай гнюснай і відавочнай бязглуздзіцы ўсё-ж вераць тысячы сялян, саматужнікаў, дробных гандляроў...

Мы антысэмітызму, што ідзе пад руку з рэлігіяй, павінны процідпастаяць інтэрнацыяналізм і бязбожжа. Не нацыянальная варожасьць, а клясавая. Не барацьба расійцаў з жыдамі і іншых нацый адна з другой, а барацьба працоўных усіх народаў з эксплёататарамі ўсяго сьвету пад кіраўніцтвам рабочае клясы.

Ніхто з нас не адмаўляў і не адмаўляе, што розьніца існуе паміж рабочымі розных прафэсій і кваліфікацый, а таксама і розных нацый. Але ў тым і справа, што гэтая розьніца перад тварам контр-рэвалюцыі, перад тварам агульнага драпежнага клясавага ворага—капіталізму стушоўваецца, адсоўваецца на самы задні плян.

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся! Ніколі яшчэ гэты лёзунг, гэты баявы заклік ня гучэў так моцна, як цяпер. Усе, хто ня з намі, супроць нас!

Памешчык, банкір, заводчык, буйны дамаўласьнік, кулак, купец, меншавік—усе яны адным фронтам выступаюць супроць СССР, супроць сацыялістычнай рэвалюцыі, і вялікдзень—іх сьвята, антысэмітызм—іх прылада

Наша сьвята ўвесну—першае мая, пралетарскі інтэрнацыяналізм — наш сьцяг, адзінства пралетарскіх радоў—наш сродак барацьбы.

С.

Чаму мы супроць вялікоднага пірага

Ну што дрэннага ў тым, што я паем мацы, ці салодкага пірага на вялікдзень,—разважаюць многія.

Што дрэннага ў тым, што я ем мацу ў адзін дзень з веруючым. Гэта ня ганьба, абы я не прызнаваў бога, ня ўкладваў у гэты звычай рэлігійнага зьместу.

Так разважаюць часта нават і некаторыя партыйцы. Ёсь і такія, што абараняюць вялікоднія салодкія пірагі. Трэба быць дурнем, каб адмовіцца ад такое смачнае ежы, як вялікодны пірог.

Згадзіцца з такімі прымірэнцкімі настроямі да вялікодных звычак некаторых бязбожнікаў і сьвядомых рабочых ні ў якім разе нельга.

Трэба не забываць, што вялікодны пірог і маца ёсьць важнейшы атрыбут рэлігійнага сьвята. Ужываньне на вялікдзень гэтых страў ёсьць вольнае ці навольнае натураньне папоўшчыне і рэлігійным звычаям. Бо вялікодны пірог такі-ж смачны да вялікадня, як і пасьля яго. Чаму ж трэба абавязкова есьці яго ў дзень сьвята разам з веруючым? Навошта траціць дзесяткі рублёў на мацу?

Сьвядомыя рабочыя і сяляне павінны памятаць, што ў дні рэлігійнага сьвята вялікодны пірог і маца—рэчы рэлігійнага культу. Прызначэньне іх—памянаць старыя запляснелыя байкі аб «уваскрашэньні» Хрыста, аб вызваленьні жыдоў з Эгіпту.

Трэба адкінуць гэтыя старыя забабоны, ніякага прымірэнцтва ў адносінах да вялікоднага культу, да «кулі чоу», мацы, да ўсякай іншай чартаўшчыны і папоўшчыны.

Рыхтуемся да 1 мая

Учора пры АПА акругкому адбылася нарада па пытаньні аб падрыхтоўцы да сьвяткаваньня 1 мая. На нарадзе былі заслуханы даклады раду арганізацый.

Белдзяржтэатр *ставіць 1 мая п'есу «Мост» для беспрацоўных і чырвонаармейцаў. Апрача таго, тэатр арганізуе карнавал у часе дэманстрацыі.*

Белдзяржкіно *арганізуе 5 кінопересовак, якія абслужачь раны на час з 25 красавіка да 7 мая. Для кіно-тэатраў Менску і рабочых клюбаў замацавана 15 карцін рэвалюцыйнага і антырэлігійнага зьместу. 1 і 4 мая ўвечары на Пляцы Волі будуць дэманстравацца кіно-карціны. 1-га мая па горадзе будзе на грузавіку разьязджаць кіно-пересоўка.*

Белжылсаюз наладжвае па ўсіх жактах дзіцячыя ранішнікі. Усе жактаўскія дамы будуць упрыгожаны сьцягамі і лёзунгамі.

Асоавіяхім *пастанавіў 3 і 5 мая арганізаваць выхад асоавіяхімаўскіх цуткоў у поле для тактычных заняткаў.*

Працаваць на вялікдзень

ВОРША. (Наш кар.). Агульна-гарадзкі сход жанчын-работніц і жонак рабочых пастанавіў не сьвяткаваць вялікадня. Жанчыны прынялі прапанову ўсім калектыўна ўступіць у саюз бязбожнікаў, а 5 і 6 мая арганізаваць на гораце збор грошай на пабудову самалёту «бязбожнік».

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). На рабочых сходах прадстаўнікі саюзу бязбожнікаў зрабілі даклады на антырэлігійныя тэмы. Рабочыя пастанавілі не спраўляць сёлета вялікодня, а адпачынак перанесьці на іншыя дні. На агульным сходзе хатнія работніцы гораду ў ліку больш 400 чалавек таксама адмовіліся сьвяткаваць вялікдзень.

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Прадаўнікі пошты пастанавілі запісацца ў гурток бязбожнікаў. Рабочыя заводу імя Домбаля адмовіліся сьвяткаваць вялікдзень, а замест яго пралоўжыць першамайскія сьвяты. Гэтымі днямі піянэры Барысаву наладжваюць вялікі мітынг-карнавал.

МЕНСК

Адкрываецца скарняжна-шапачная фабрыка

З 1 ліпеня ў Менску адрываецца новая скарняжна-шапачная фабрыка на 140 рабочых. Фабрыка зойме дом Меншаго, які да ліпеня пароўдзе ў новае памашканьне. На фабрыцы будуць шыць футры і галаўныя ўборы на суму да 5 мільёнаў руб. у год.

Фота-апараты ў крэдыт

Белдзяржкіно хутка атрымае 60 фота-апаратаў. Фота-камісія ЦСПСБ узбудзіла ходайніцтва перад прэзыдыумам ЦСПСБ аб прыняцьці мер для павялічэньня сумы ліцэнзій на ўвоз з-за межы дадатковай кольчасьці апаратаў і фота-прылад. Прызнана патрэбным, каб фота-апараты выдаваліся Белдзяржкіно ў крэдыт тэрмінам на 6 месяцаў з дапушчэньнем скідні.

КУРОРТНЫ СЭЗОН. ЦП саюзу працасьветы закупіла для настаўнікаў да 30 курортных месц у санаторыях «Злынка», Бранскай губ. і Геленджыка (Крым).

„Налёт" ваенкораў АБВШ

20 красавіка ваенкоры часьцей БВА зробяць налёт на сутаварыскія і іншыя, прадпрыемствы. Мэта налёту—выявіць як заводы ўдзельнічаюць у сацыялістычных спаборніцтвах, як дапамагаюць яны пасёўнай кампаніі на вёсцы.

Ваенкоры АБВШ робяць налёт на наступныя прадпрыемствы: завод «Энэргія», дэпо МББ чыг. і вагонныя майстэрні.

Падрыхтоўка да налёту амаль што скончана. Вылучаны групы, якія павінны ўсебакова абсьледаваць прадпрыемства.

Увесь матар'ял абсьледаваньня зьмясьцяецца ў насьценгазэце прадпрыемства.

Акрамя гэтага, матар'ял будзе скарыстаны ў мясцовым друку, шматтыражнай газэце школы і ў «Красноармейской Правде».

Курсы па падрыхтоўцы ліквідатараў няпісьменнасьці

Таварыства «Проч няпісьменнасьць» арганізуе ў усіх раёнах БССР тыдневыя курсы па падрыхтоўцы ліквідатараў няпісьменнасьці. Курсы выпусьцяць да 2.500 ліквідатараў няпісьменнасьці.

Водгукі на заметкі

У газ. «Зьвязда» № 52 быў зьмешчан артыкул пад назвай «Аб алараце і апаратчыках з Наркамзэму», у якім пісалася, між іншым, і аб супрацоўніцы наркамзэму НКЗБ т. Лекаш, што яна дачка былых гандляроў. Расьсьледваньнем выяўлена, што бацька Лекаш на працягу 40 год працуе столярам, але гадоў 16 таму назад бацькі яе мелі краму, якая праіснавала ўсяго 1½ гады і закрылася.

Прыватнік і „Земляроб"

(Да справы млынара Ліўшыца)

У № 32 нашае газэты ў заметцы: «Савецкі судзьдзя і сын Фэміды» асьвятляўся цікавы факт, як судзьдзя Зыскінд аб'ектыўна апраўдаў млынара Ліўшыца. Таго самага Ліўшыца, які ня вёў ніякага вучоту памольнага абору і ня выпісваў квіткоў памольнічкам у часе праверкі млыну і дазволіў сабе хуліганскі ўчынак у адносінах да праверачнай камісіі.

Пасьля заметкі справа была накіравана ў суд для новага разгляду. У выніку Ліўшыц атрымаў 8 месяцаў пазбаўленьня волі.

Пры новым разглядзе справы судом вынесена наступнае прыватнае адзначэньне.

Згодна дагавору ад 20-га лістапада 28 г. Ліўшыц павінен быў здаваць памольны збор спажывецкаму т-ву «Земляроб».

Праўленьне «Земляроба» згодна параграфу 10 пастановы Наркамгандлю за № 55 павінна было забясьпечыць млыны прашнуравальнымі квіткоўымі кніжкамі. Аднак гэтага ня было зроблена, чым яшчэ больш паслаблен кантроль за млынамі Ліўшыца. Справа аб невыкананьні «Земляробам» пастановы Наркамгандлю перадана ў НК РСІ Беларусі для прыцягненьня кіраўнікоў менскага таварыства «Земляроб» да адказнасьці.

Крымінальная касацыйная калегія акрсуду новы прыгавар зацьвердзіла.

Інр.

Кнігі для рэцэнзіі

Рэдакцыяй „Зьвязды" атрыманы для рэцэнзіі наступныя кнігі:

М. Хведаровіч—«Настроі», зборнік вершаў.

Вэйрна—п'еса «Ботэін» на жыдоўскай мове.

«Полымя»—часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі і крытыкі, за сакавік.

П. Ільючонак—„Малпы".

«Між мыцьцём і сьмерцю»—зборнік вязьнічайных апавяданьняў.

Конан-Дойль—„Глыбіня Маракота".

Гарабурда—«Сусьвет і Зямля», падручнік для 4 году навучаньня.

Г. Рудоміно—«Грамадзэнаўства», падручнік для 7-га году навучаньня.

В. Страноўскі—«Чарговыя пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва».

Гамарнік — Даклад на XII зьезьдзе КП(б)Б.

Г. Сагаловіч—Спытак мэтадычных прац, частка 2.

«Казка пра трох козак»—для дзетак на жыдоўскай мове.

Э. Гэзін—«Освальд», дзіцячая п'еса.

«На тым баку шчыліны»—п'еса на жыдоўскай мове.

Г. Яброў—Жыдоўская літаратура ў пытаньнях і адказах, частка 2-ая.

Д. Гофштэйн—„Спартак", п'еса на жыдоўскай мове.

И. Чукоўскі—«Мыйдадзірак» кінематограф для дзетак.

Ліст у рэдакцыю газэты „Зьвязда"

У газэце «Зьвязда» ад 3-IV—29 г. № 74 зьмешчан артыкул пад загалоўкам: «Бюракраты з Белсельсаюзу».

Па праверцы паказаныя факты ў гэтым артыкуле ў большасьці не пацьвердзіліся. Папершае, у Белсельсаюзе бухгальтара Меліхава няма. Няма зусім такою № 18. Няма таксама мэліяральнага аддзелу, і мы ад Наркамзэму мэліяральных таварыстваў яшчэ не прынялі і такога аддзелу не стварылі.

Аб тым, што машыністкі фарбуюць губы і надта шчыра і доўгі час чысьцяць ногі, або па ўстанове ходзяць супрацоўнікі, залажыўшы рукі ў штаны, супярэчыць мабыць і ня трэба, але-ж я гэтага не заўважаў. Прычым зараз апарат настолькі нагружаны работай, што, бадай, наўрад ці каму-небудзь удасьцца з супрацоўнікаў ці з машыністак займацца манікюрамі ці хадзіць па ўстанове бяз працы.

Дапусьцім, што гэта было і сапраўды так, але-ж прычым тут бюракраты з Белсельсаюзу, па адрасе якога, або сыстэмы с.-г. каапэрацыі накіраваны гэтыя выразы. Няхай працаўнікі газэт пакажуць хоць адну ўстанову, дзе машыністкі і супрацоўнікі былі-б лепшымі, ці зусім іншымі, як у Белсельсаюзе. Мы-ж сапраўды добра ведаем наогул прыроду нашай савецкай машыністкі і савецкага служачага, які нікольні не адрозьнівацца ад служачага або машыністкі каапэрацыйных органаў. Дзеля чаго-ж тады за ўсе нашы грахі, якія ёсьць у любой установе (ЦВК, СНК, ВСНГ, НКФ і інш.) лаяць Белсельсаюз, а ня іншыя ўстановы і г. д.

Такія абразьлівыя выразы, як бюракраты, пускаць зусім не заслужана па адрасе сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі, зьяўляецца лёгкадумным з боку тых, хто пісаў гэта ў газэтах, і гэта яшчэ гаворыць і аб тым, што да гэтага часу няма неабходных, належных узаемлівых адносін да каапэрацыі з боку нашага партыйнага друку.

Прашу надрукаваць у бліжэйшым нумары вашай газэты

З камуністычным прывітаньнем

Старшыня праўленьня Белсельсаюзу А. ДУБІНА.

Заўвага рэдакцыі—Заметка, аб якой піша т. Дубіна, была складзена на падставе матар'ялаў, даных абсьледваецелем бюро скаргаў РСІ пасьля «налёту» на ўстановы.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

— У пятніцу, 19-IV, а 9 гадз. увечары, у клюбе навуковых работнікаў (Комуністычная вул.) адбудзецца пасяджэньне асьпірантскага семінара (грамадзеведаў і прыродазнаўлаў). Даклад т. Гольмана «Тэхніка навуковай работы». Пасьля дакладу—абмен думкамі».

КЛЮБ ІМЯ КАРЛА МАРКСА. Сёньня, а 10 гадз. увеч, заняткі спартыўнага гуртка ў доме Камсамолу,—падрыхтоўка да 1-га мая, а 7 гадз —заняткі гуртка ІЗО,—пытаньне аб першамайскім упрыгожаньні клюбу і падрыхтоўка выстаўкі работ гуртку.

Заўтра, а 8 гадз.—заняткі струннага аркестру пад кіраўніцтвам т. Егудкіна,—падрыхтоўка рэпэртуару да першамайскай дэманстрацыі і вечароў.

У суботу, а 8 гадз., заняткі драмгуртка. Запрашаюцца т. т. Баранаў і Пальчэўскі (Белапп).

— Сёньня, а 6 г. увеч. у клюбе будаўнікоў (3-ці паверх) адбудзецца агульны сход усіх рабочых замацаваных за «Водоканалстроем». Парадок дня: Абмеркаваньне новага калектыўнага дагавору. Яўка ўсіх абавязкова.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. У пятніцу 19-IV, а 7 з пал. г. ув. агульны сход асьвяніваў гораду, на парадку дню даклад «Чаму Троцкі скаціўся ў лягер буржуазіі».

— У чацьвер, 18-IV, а 7 гадз. увечары, у памяшканьні Дому Асьветы склікаецца сход партактыву Фрунзаўскага раёну.

У парадку дня. Шляхі падняцьця сельскае гаспадаркі і падатковыя пілёгкі сераднятву (па тэзісах да XVI партканфэрэнцыі) даклад т. Міцьк...

На актыў запрашаюцца члены ЦК, ЦКК, АК, АКК, РК (праходжэць па сваіх пасьведчаньнях), члены фракцыі ЦСПСБ, ЦП саюзаў Фрунзаўскага раёну, члены бюро яч., фракцыі ФЗМК, шэф. таварыстваў, гаспадарнікі—партыйны, прапагандыстыя і пазаштатныя інструктары раёну.

Білеты на ўваход можна атрымаць у РК.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

КІНО КУЛЬТУРА 20 МАЯ

УСЕ НА ДАПАМОГУ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫМ І ІХ СЕМ'ЯМ!

(Для тэатральнай лётарэі, якая арганізоўваецца Мекскім акруговым камітэтам МОПР'у).

АДЗІНЫ ВЯЛІКІ МАСТАЦКІ КАНЦЭРТ

УДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ:

Народны артысты рэспублікі—прэм'ер 1-га Маскоўскага Мастацкага Тэатру Васіль Іванавіч КАЧАЛАЎ

Заслужаны артысты рэспублікі—прафэсар Маскоўскай Кансэрваторыі салісты Маскоўскага Вялікага Акадэмічнага Тэатру Барыс Осіпавіч СІБОР (СКРЫПКА)

Артыстка Маскоўскай Музыкальнай студыі імя Народн. артыст. Рэспублікі К. С. Станіслаўскага Галіна Мікалаўўна ГАРШУКОВА (ОЬПЕВЫ)

Прэм'еры Маскоўскага Вялікага Акадэмічнага Тэатру

ПРЫМА БАЛЕРЫНА МАРЫЯ РЭЙЗЕН

БАЛЕТМЭЙСТАР ЛЕАНІД ЖУКАЎ

Вольны мастак С. К. СТУЧЭЎСКІ (РАЯЛЬ).

Падрабязнасьці ў праграмах. Білеты разыгрываюцца ў ячэйках МОПР'у прадпрыемстваў і ўстаноў.

УСЕ БІЛЕТЫ НА ГЭТЫ КАНЦЭРТ—ТОЛЬКІ ПРАЗ ТЭАТРАЛЬНУЮ ЛЁТАРЭЮ.

Усе віды прапускоў на гэты канцэрт не спраўдзны.

Пачатак канцэрту роўна а 9 гадз.

Выйгрышныя білеты абменьваюцца на тэатральные білеты на канцэрт у аддзеле МОПР'у (Савецкая 87, другі паверх) штодзенна ад 7 да 9 гадз. увеч., акрамя аўторнаў.

ЛЁТАРЭЙНАЯ КАМІСІЯ

ТЭАТР, КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Чацьвер, 18 красавіка

Для агульна-адукацыйных курсаў

КАР'ЕРА „таварыша" БРЫЗГАЛІНА

— — Пачатак а 8 гадз. увеч. — —

Кіно-тэатр КУЛЬТУРА

Навінка сэзону 1929 г. вытворч. БЕЛДЗЯРЖКІНО

Песьня вясны

сучасная бытавая кіно-п'еса ў 6 част. на аповесьці народ. паэты БССР ЯКУБА КОЛАСА.

КІНО ІМЯ ЦЫБКА

Ад аўторка, 16 красавіка мастацкі фільм

ЯЕ ШЛЯХ

сцэнары на апавяданьні М. Шчыціна (Сібірскага) „МАРЫНА".

КІНО ПРАЛЕТАРЫ

Гарольд Лёйд у бліскучай камэдыі

МАРАК

Звыш праграмы кіно-хроніка № 11—'29

1-шы ДЗІЦЯЧЫ кіно-тэатр ЮНЫ ПІЯНЭР (памяшканьне кіно „ПРАЛЕТАРЫ")

Стэнлей у глыбі Афрыкі

1-ая серыя у 8 частках

Пачатак сэансаў у 3, 4 і 5 г. Каса ад 2-х г. цана білету 10 к. Месцы нумараваныя

КІНО СПАРТАК

Амэрыканскі трука-прыгодніцкі фільм

Аванцюрысты Джымі Блек

З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА"-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3-ЦІ ПАВЕРХ.

ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭННІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ І ІНШЫЯ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

Да пасеўнай кампаніі

ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПРАДАЮЦЦА ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ

Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і Белкаапсаюзу

НАСТУПНЫЯ КНІГІ:

Я. ГРАБОЎСКІ.—Аб насеньні (як і чым палепшыць насеньне, 2-е выд.). Стар. 68. Цана 25 к.
ЯКАЎЛЕЎ Я.—Аб павялічэньні ўраджайнасьці. Стар. 60. Цана 25 к.
СЬПІЧЭНКА.—Як загатаўляць с.-г. прадукты. Стар. 80. Цана 35 к.
АЛЯКСЕЯЎ Е.—Сэрадэля—трава на корм і ўгнаеньне. Стар. 68. Цана 18 к.
ШЫБКО Т.—Скарыстаньне балота, 2 выд. Стар. 62. Цана 15 к.
ЗАЯЦ П.—Зернаачышчэньне. Стар. 34. Цана 10 к.
РЫБАКОЎ.—Кантрактацыя. Стар. 68. Цана 20 к.
ПЕРАФЯРКОВІЧ.—Якія прадукты загатаўляць для продажу заграніцу. Стар. 68. Цана 20 к. Сто пудоў ураджаю, 2-е выд. Стар. 80 Ц. 25 к.
Н. ЛЬВОЎ.—Сялянскі сад. Стар. 72. Цана 25 кап.
ПРАКАПЕНКА.—Канюшына. Стар. 60. Цана 15 к.
ЦЯРОХІН.—Плодовыя галавальнікі. Стар. 84. Ц. 10 к.
БАХЦЕЯЎ І САВІЦКІ.—Попел, як угнаеньне. Стар. 28. Цана 10 к.

ЗНАХОДЗЯЦЦА У ДРУКУ І У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС ПАСТУПЯЦЬ У ПРОДАЖ

МІНЦ.—Зялёныя фабрыкі.
АЛЯКСЕЯЎ.—Зялёнае лубінавае ўгнаеньне.
РЫБАКОЎ.—Машыновыя таварыствы.
ЛАЙКОЎ.—Якія шматпольныя севазвароты раіць часопісь «Плуг» для сял. Беларусі.
ЛАЙКОЎ.—Нарыс па грамадзкай агранаміі Беларусі.
УЛІЦЫН.—За ўраджай.
КАЧАТКОЎ.—Хэмія на службу селяніну. Кантроль насеннага матар'ялу.
ЯКАЎЛЕЎ.—Барацьба за ўраджай, 2-е выд.
РЭГО.—Ці можа перарадзіцца збожжа.
БАХЦЕЕЎ.—Як працаваць на абсушаным балоце.
ГУРСКІ.—Угнаеньне глебы (польск.)

Белдзяржвыдавецтва

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" званіце па тэл. 2-49

Тэрмінова ПРАДАЮ РАЯЛЬ

м. Койданава 2-я Сялянская вул. д. № 48, кв. Тарнаўскага

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты

лічыць несапраўднымі:

Вайсковая кніжка Зяцікава І. І., выд. Жлобінскім РВК. 1499
Лекавая кніжка Кац М. Э., выд. Менстрахкасай. 1495
Матрычная выпіс Аркоўскага Б. Г. 1497
Кандыдацкая картка № 12727 Мусінай М. Г., выдав. Менскім Акругкомам КП(б)Б 1498
Разьліковы ліст на кватэрную плату Марголінай Л., выдав. Менкамгасам. 1499
Пашпарт Юркавскага Р. А., выд. Менскай міліцыяй. 1500

Кошт публікацыі 50 к. аб згубе дакуманту

ПАДРУЧНІКІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ, ВЫДАНЫЯ Ў 1929 Г.

Вайтэнка В. Т.

1. Агульнае рахункаведзтва — Пасобнія для ВНУ, прам.-эк. тэхн. бухг. курсаў і спец. класаў.
2. Практычная тэма агульнага рахункаведзтва — З поўнымі рашэньнямі і тлумачэньнямі па двайной сыстэме. Пасобнікамі можна карыстацца і для самаатрымання. Набыць можна на бухгальтарскіх курсах
3. Камэрцыйныя вылічэньні — Пасобнік для ВНУ, прам. эк. тэхн. бухг. курсаў спец. класаў.
4. АСНОВЫ СТАТЫСТЫКІ

НА МАЙ І ДА КАНЦА ГОДУ

АДКРЫТА ПАДПІСКА — НА ГАЗЭТУ — ЗЬВЯЗДА

НА МАЙ І ДА КАНЦА ГОДУ

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90 к., на 3 м.—2 р. 60 к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.

«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадатковыя на льготных умовах часопісі:

Бальшавік Беларусі	Рабоча-Крестьянскі Корреспондент	Огонек
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:

У Менску — У галоўнай канторы газэты «Зьвязда»—Савецкая, 63, 3-ці паверх, штодзенна ад 9—5 г., упоўнаважанымі галоўнай канторы.

У правінцыі: — Аддзяленьнямі БДА, аддзяленьнямі Савецтва „Известия" і „Правда", ніводнай кантраг. друку і ўсімі пашт.-тэл. ...

Менск Галоўлітсел № 609.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск